Пралетарыі ўсіх краеў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган [illegible] Камітэту Саветаў БССР.

10 го[illegible]

154 кр. "Савецкая Беларусь"
Одесса, Пастера 13, государ-
ствен. публичн. библиотека.
студэ. сынок. адзін экз.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478, Рэдактара—№ 769.

Матэр'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:	
На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:	
За радок нанпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нанпарэлі паспрод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.
Спажывецкія на 50 проц. даражэй.	
Зьмены тарыфу бярэцца 10 проц. накіду.	

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:	
За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб. [illegible]	

НАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх паштова-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 225 (2714) Серада, 2-га кастрычніка 1929 г.

МАГУТНЫМ „УРА“ ВІТАЛІ ПРАЛЕТАРЫІ МЕНСКУ ЧЫРВОНЫХ БАЙЦОЎ

Учора пралетарыі Менску спатыкалі чырвоных байцоў, якія з летняй палявой вучобы—манэўраў прыбылі на зімнія кватэры.

Спатканьне чырвонаармейцаў, палітработнікаў і камандзіраў з рабочымі і служачымі абярнулася ва ўсеагульнае пралетарскае сьвята.

Аб правядзеньні „Дню ўраджаю і калектывізацыі“ сельскай гаспадаркі.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

Шырэй разгарнуць масавую калектывізацыю.—Разгортваючы актыўнасьць бядняцка-серадняцкіх колаў, адзначыць гэты дзень арганізацыяй новых калгасаў, заснаваньнем саўгасаў і ўтварэньнем трактарных калён.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР пастанаўляе абвясьціць 14-га кастрычніка днём ураджаю і калектывізацыі сельскай гаспадаркі і заклікае ўсіх рабочых, батрацтва, бядняцкае і серадняцкае працоўнае насельніцтва вёскі да актыўнага ўдзелу ў найбольш пасьпяховым правядзеньні „дню ўраджаю і калектывізацыі“.

Прэзыдыум ЦВК зварочваецца да ўсіх грамадзкіх арганізацый з заклікам [illegible] ўдзелу і [illegible] пасьпяховаму правядзеньню „дню ўраджаю і калектывізацыі“ сельскай гаспадаркі.

Прэзыдыум ЦВК БССР лічыць, што гэты дзень павінен быць праведзен з гэтай падагуленьня вынікаў працы па калектывізацыі сельскай гаспадаркі і далейшага падняцьця ўраджайнасьці; правядзеньне „дню ўраджаю і калектывізацыі“ павінна садзейнічаць яшчэ большай мабілізацыі ініцыятывы і самадзейнасьці батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх працоўных мас сялянства, у далейшай працы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і пераможнай барацьбы з кулацтвам. Апроч таго, „дзень ураджаю і калектывізацыі“ сельскай гаспадаркі, правядзеньні якога будуць удзельнічаць шырокія масы працоўных, павінен стаць новаю ўрачыстасьцю працы і культуры ў справе перабудовы вёскі на сацыялістычных падставах.

У гэты дзень павінна быць шырока разгорнута папулярызацыя сярод працоўных мас насельніцтва БССР пяцігадовага пляну індустрыялізацыі краіны і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, мэтай пасьпяховага вырашэньня задач, якія вызначаны па пяцігодцы, па асобных акругах і раёнах.

Для ажыцьцяўленьня вызначаных мерапрыемстваў Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім акруговым і раённым выканаўчым камітэтам безадкладна і яшчэ больш рашуча разгарнуць працу па калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак праз спалошную калектывізацыю вёсак і іншых паселішчаў, прыстасоўваючы арганізацыю калгасаў, заснаваньне саўгасаў [illegible] „дню ўраджаю і калектывізацыі“.

2. Акруговым і раённым выканаўчым камітэтам [illegible] ў вызначаецца [illegible] наньня закону па [illegible] самае і джайнасьці сельскай гаспадаркі.

3. Утварыць праверку існуючых дагавораў па сацыялістычнаму спаборніцтву з прыцягненьнем да гэтай справы грамадзкіх арганізацый. Разам з гэтым знайсьці таксама новыя магчымасьці, якія спрыялі-б заключэньню новых дагавораў паміж калгасамі, саўгасамі і паасобнымі вёскамі.

4. Прапанаваць Наркамасьветы і НК Аховы Здароўя прыняць захады да адчыненьня да „дню ўраджаю і калектывізацыі“ культурна-бытавых установаў у саўгасах і буйных калгасах. Забясьпечыць у тых-жа сельска-гаспадарчых аб'яднаньнях ліквідацыю ў працягу 1929-30 году няпісьменнасьці, прыцягнуўшы да гэтай справы таварыства „Прэч Няпісьменнасьць“.

5. Беларускаму Дзяржаўнаму Выдавецтву пасьпяшыць з выданьнем сельска-гаспадарчай літаратуры, галоўным чынам па калектыўнаму будаўніцтву, і своечасова распаўсюдзіць яе сярод сялянства на вёсцы.

6. Прапанаваць Беларускаму Дзяржаўнаму Кіно запясьпечыць абслугоўваньне ўсіх кіно-перасовак вёскі кінофільмамі адпаведнага зьместу і ўжыць захады да набыцьця такой кінофільмы, якая адлюстроўвала-б будаўніцтва, ўмовы і быт калгасных гаспадарак Беларускае ССР.

7. Прапанаваць Белкаапсаюзу правесьці да вызначанага дню 100-проц. каапэраваньне рабочых саўгасаў і сяброў калгасаў, праверыць якасьць іх абслугоўваньня спажывецкай каапэрацыяй, прыняўшы адначасова меры да прыстасаваньня сваёй сеткі да лепшага абслугоўваньня саўгасаў і калгасаў.

8. Акрвыканкомам [illegible] узьняць якасьць [illegible] тых экспанатаў трэба з усёй выразнасьцю [illegible] Выстаўку.

9. Ухваліць мерапрыемствы, якія вызначаны Цэнтральнай Камісіяй па правядзенью „дню ўраджаю і калектывізацыі“ ў БССР, па зьбіраньні на добраахвотных падставах сродкаў на арганізацыю трактарнай калёны БССР. Прапанаваць усім Цэнтральным і мясцовым органам аказваць працоўным і адпаведным грамадзкім арганізацыям садзейнічаньне ў правядзеньні мерапрыемстваў па набыцьці і зьбіраньні сродкаў для гэтай мэты.

10. Лічыць неабходным камандыраваць у „дзень ураджаю і калектывізацыі“ сяброў ЦВК і адказных працаўнікоў цэнтральных устаноў па месцы, асабліва ў раёны спляшной калектывізацыі, у буйныя саўгасы і калгасы, дзеля ўдзелу ў правядзеньні „дню ўраджаю і калектывізацыі“.

Час. вык. аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч**.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **У. Ігнатоўскі**.

28 верасьня 1929 г.
г. Менск.

У пралетарскай злучнасьці

Яшчэ задоўга да прыходу чырвонай коньніцы ўсе вуліцы былі запоўнены калёнамі працоўных. Чырвоныя сьцягі, лёзунгі, кветкі гаварылі аб вялікім сьвяце: сёньня працоўныя Менску вышлі спаткаць свайго вернага вартаўніка Чырвоную армію. Рознакаляровыя хусткі, кепі, рабочыя тужуркі ў ваппе зьліліся ў адну дружную грамаду, чакаючы прыходу чырвоных байцоў.

—У вайсковыя гурткі, узмацніць абарону нашай краіны!—заклікае чырвонымі літарамі лёзунг. Яго радасна нясуць вучні школы, якія сьпяшаюцца на спатканьне абаронцаў працоўных.

— Узмацнім індустрыялізацыю, пашырым калектывізацыю вёскі—гэта лепшая забясьпека абароназдольнасьці краіны — абвяшчае лёзунг рабочай калёны. Вопратка і твары ўдзельнікаў калёны паказваюць, што яны толькі што з працы, не пасьпелі адпачыць. Яны вышлі вітаць сваю надзейную варту. Яны вышлі паказаць і яшчэ раз сказаць, што ні на хвіліну не забываюць аб сваіх задачах.

Хутка ляціць час. Уже пачало зьмяркаць, калі чырвонай стужкай лёгкім галёпам паліласся кавалерыя. Гукі аркестраў і гучнагаварыцеля, вусныя лёзунгі працоўных, грамавое „ура“ кавалерыстаў і тупат конскіх ног—зьлілося ў адну магутную сымфонію. У гэтым шуме нельга было разабраць словы. Але яны і не патрэбны, байцы, палітработнікі, камандзіры, працоўныя добра адчувалі і разумелі, што працоўныя ля варштату і Чырвоная армія—неразлучны атрад, які ў патрэбны момант можа [illegible] на вінтоўку і вінтоўку на варштат.

[illegible] і пра[illegible] байцоў на зімовыя [illegible] што мы непераможныя.

Учарашні вечар будзе доўга памятны. Ён яшчэ раз [illegible] што працоўныя разам з Чырвонай арміяй—магутны, непераможны атрад будаўнікоў новай сацыялістычнай грамады.

* * *

Учора а 5-й гадзіне ўвечары працоўныя гор. Менску спатыкалі самарцаў, якія вярнуліся з манэўраў. Спатканьне абярнулася ў вялікае сьвята.

У дэманстрацыі ўдзельнічала некалькі тысяч працоўных.

ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ НА МАЗЫРШЧЫНЕ

Калектыўная здача хлеба ў каапэрацыю на Мазыршчыне прыняла масавы рух.

За грошы, якія атрымліваюць пры прадажы хлеба у каапэрацыю, бедната і серадняцтва купляюць аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Нядзеля 29-га верасьня для Мазыршчыны было сьвятам. Сотні фурманак хлеба прывезьлі сяляне ў каапэрацыю ў горад Мазыр, дзесяткі фурманак хлеба прывезьлі бедняцкі і серадняцкі ў Нараўлянскія і ў другія каапэрацыйныя крамы.

Апошнія дні верасьня месяца былі пераломнымі ў справе разгортваньня хлебазагатовак, былі пераломнымі ў справе калектыў[illegible] хлеба. Дагэтуль-жа на [illegible]

У нядз[illegible] вечару каапэрацы[illegible] раёнах [illegible] цыямі Мазыру прыймаўся хлеб [illegible] чырвоных абозаў. З Нараўлянскага раёну сяляне Бібікаўскага сельсавету здалі 9506 кілёграмаў збожжа, з в. Кустаўніцы здалі 775 кілёграмаў з в. Міхалкі прывезена 4642 кілёграмы збожжа.

Бедняцкі і серадняцкі Валіка Бякаўскага сельсавету Каралінскага раёну здалі 606 пудоў і 30 фунтаў хлеба. За атрыманыя ад прадажы хлеба грошы (звыш 890 р.) бедната і серадняцтва паравашні падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Сярод зданага збожжа 70 працантаў жыта.

Трэба адзначыць, што каапэ[illegible] [illegible] аддзе[illegible] [illegible] стаўцы, які паказаў-бы шкоду [illegible] сьвят (Пакровы) і досгрошай не [illegible] пролетар[illegible] [illegible] годныя

ДА АБГАВАРЭНЬНЕ ПРАЭКТУ „АСНОЎНЫХ ПАЛАЖЭНЬНЯЎ АБ АРГАНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ У САЮЗЕ ССР“.

УСІМ САВЕТАМ І ВЫКАНАЎЧЫМ КАМІТЭТАМ БЕЛАРУСКАЕ ССР.

Прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР, разгледзеўшы 2-га верасьня г. г. праэкт асноўных Палажэньняў пра арганізацыю сельскіх саветаў у Саюзе ССР“, пастанавіў, з прычыны асаблівай важнасьці гэтага праэкту і неабходнасьці шырокага азнаямленьня з ім шырокіх рабочых і сялянскіх мас і ўсяго актыву савецкіх і грамадзкіх арганізацый, перадаць праэкт праз цэнтральныя выканаўчыя камітэты саюзных рэспублік на папярэднае абгаварэньне працоўных у мясцовых саветах і грамадзкіх арганізацыях.

На падставе гэтай пастановы Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР 17-га верасьня г. г. даручыў усім выканаўчым камітэтам і саветам БССР абгаварыць праэкт асноўных Палажэньняў пра арганізацыю сельскіх саветаў у Саюзе ССР“ на сваіх пленарных пасяджэньнях і забясьпечыць таксама шырокі ўдзел у абгаварэньні праэкту шырокіх працоўных мас.

Гэты праэкт новага саюзнага закону мае на мэце лепш прыстасаваць ніжэйшы савецкі апарат да выкананьня задачы па індустрыялізацыі краіны і перабудовы на калектыўных асновах сельскай гаспадаркі. Шырокае абгаварэньне праэкту павінна выявіць, наколькі ён забясьпечвае вырашэньне пастаўленых перад сельскімі саветамі задач, наколькі арганізацыйная структура сельскіх саветаў будзе адпавядаць гэтаму вырашэньню.

Пры абгаварэньні праэкту прапануецца асобна застанавіцца і абмеркаваць пытаньне аб арганізацыі сельскіх саветаў ва ўсіх паселішчах (арт. 1 праэкту); пытаньне аб арганізацыі самастойных сельскіх бюджэтаў ва ўсіх сельскіх саветах (арт. 15); правы і абавязкі рэвізійных камісій пры сельскіх саветах (арт. 7); наколькі пашырэньне праў сельскіх саветаў (гл. арт. 8—28) забясьпечвае самастойнасьць сельскіх саветаў; наколькі правы сельскіх саветаў у галіне сельскай гаспадаркі, разьвіцьця гаспадаркі і культурнага будаўніцтва вёскі і ін. галінах забясьпечваюць разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва, падняцьце ўраджайнасьці, сапраўднае падняцьце культурнага і палітычнага ўзроўню насельніцтва, якову інтарэсаў батрацтва і беднаты, пытаньне аб зацьверджаньні пастаноў сельскіх сходаў сельскімі саветамі і г. д.

Гэтыя моманты праэкту і іншыя трэба абмеркаваць у вызначаны Прэзыдыумам ЦВК БССР тэрмін і ў абагуленым відзе падаць у Арганізацыйны Аддзел Прэзыдыуму ЦВК БССР да 25-га кастрычніка г. г.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР падкрэсьліваючы важнасьць паказанай работы, абавязвае выканаўчыя камітэты і саветы шырока разгарнуць абгаварэньне праэкту „Асноўных Палажэньняў аб арганізацыі сельскіх саветаў у Саюзе ССР“ падняць дыскусію па гэтым пытаньні на належную вышыню і тым аказаць значную дапамогу ў справе выданьня гэтага вельмі важнага саюзнага закону.

Час. Вык. Аб. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч**

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **У. Ігнатоўскі**

28 верасьня 1929 г.
гор. Менск

Бурнае пасяджэньне нямецкага рэйхстагу.

ПАД АХРАНАЙ ПАЛІЦЫІ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ ПРАВОДЗЯЦЬ ЗАКОН АБ БЕСПРАЦОЎНЫХ.

БЭРЛІН, 30-IX. Сёньня адбылося адчыненьне рэйхстагу. Будынак рэйхстагу задоўга да адчыненьня быў абкружан моцнымі парадамі пешай і коннай паліцыі. На пасяджэньні камуністычны дэпутат патрабаваў зьняць з парадку дню пытаньне аб скарачэньні дапамогі беспрацоўным. Пры шумным адабрэньні ўсёй камуністычнай фракцыі, Штэкер рэзка пратэставаў супроць абкружэньня рэйхстагу паліцэйскім кардонам, які складаецца з многіх соцен паліцэйскіх, пад абаронай якіх мяркуецца правесьці зьніжэньне дапамогі беспрацоўным. Ад імя камфракцыі ён запрапанаваў уключыць у парадак дню пытаньне аб заработнай плаце, аб барацьбе супроць дарагоўлі. Штэкер запрапанаваў таксама паставіць пытаньне аб пляне Юнга і зьвязаных з ім пытаньнях замежнай палітыкі. Прапанова Штэкера была адхілена.

Лідэр нацыяналістаў Вэстарп заявіў, што фракцыя, якую ён прадстаўляе, таксама выказваецца супроць камуністычнай прапановы абгаварыць плян Юнга. Вэстарп агаварваецца, аднак, што нацыяналісты самі ўнясуць гэтую прапанову. Пры гэтым на лавах камуністаў пачаўся бурны сьмех і раздаліся выгукі: „пасьля згоды з Клейнэ“. Пасьля гэтага выступіў з дакладам аб дапамозе беспрацоўным міністр Віссэль.

Стотысячная дэманстрацыя.

БЭРЛІН. На заклiку камуністычнай партыі прыняць удзел у дэманстрацыі пратэсту, якая належвалася ў Люстгартэне супроць зьніжэньня дапамогі беспрацоўным, пасьледвала звыш **100 тысяч рабочых**, якія рушыліся ў Люстгартэн магутнымі арганізаванымі працэсіямі з 20 раёнаў. Рабочыя соцен фабрык і заводаў, у асаблівасьці будаўнічых прадпрыемстваў, пакінулі фабрыкі і заводы да сканчэньня працы. Дэманстрацыя мела яўна выражаны характар масавай дэманстрацыі рабочых фабрык і заводаў. Дэманстранты-рабочыя ішлі са сваімі сьцягамі. У дэманстрацыі прыняла ўдзел таксама антыфашысцкая абарона і чырвоныя франтавікі ў форме саюзу, ня гледзячы на забарону. Самкнутымі шматлікімі шэрагамі бастуючыя трубапракладчыкі прайшлі са шматлікімі плякатамі, якія выкрывалі штрэйкбрэхэрства рэфармісцкіх лідэраў. На мітынгу выступала адначасова больш 20 прамоўцаў. Пад бурныя выгукі адабрэньня ўдзельнікаў мітынгу быў прыняты тэкст тэлеграмы цэнтральнаму камітэту нямецкай кампартыі і аўстрыйскаму пралетарыяту. У прывітаньні да аўстрыйскага пралетарыяту бэрлінскія рабочыя выказваюць сваю поўную салідарнасьць з рабочымі Аўстрыі.

Працэсіі рабочых неаднакроць перашкаджала паліцыя якая праводзіла арышты на зборных пунктах. Вельмі часта паліцыя кідалася на дэманстрантаў таксама і ў паасобных гарадзкіх раёнах. У працэсіі прымала ўдзел 200 бэрлінскіх раёнаў. Дэманстрацыя пратэсту супроць зьніжэньня дапамогі беспрацоўным адбылася таксама і ў шэрагу іншых гарадоў.

У лягеры кітайскай контр-рэвалюцыі.

Нездаволеньне палітыкай Нанкіну.

ТОКІЁ, 30-9. Як паведамляюць з Манчжурыі, ні Чжан-Сюэ-Лян, ні Чжан-Цзо-Чан (пекінскі губэрнатар), якія назначаны галоўнакамандуючымі манчжурскіх армій, ніводнага разу ня выехалі з сваіх «сталіц» (г. зн. з Мукдэну і Дзірмы) да мяжы, або ў Харбін, а таксама не зрабілі ніводнай заявы ў духу Нанкіна. Наадварот, Чжан-Цзо-Чан нават больш адкрыта, чымся Чжан-Сюэ-Лян, выказвае сваё нездавальненьне палітыкай Нанкіну ў савецка-кітайскім канфлікце.

Вярнуўся з Японіі.

ТОКІЁ, 30-9. Чан-Чы, які езьдзіў у Японію з неафіцыйнай місіяй, зьвярнуўся ў Мукдэн. Ён паведаміў Чжан-Сюэ-Ляна і паведаміў яму аб выніках сваей паездкі.

Лічбы арыштаваных.

ТОКІЁ, 30-IX. Як паведамляюць з Харбіну, наступныя, абсалютна праверaныя, але далёка няпоўныя лічбы даюць уяўленьне аб рэпрэсіях, якія ўжываюцца адносна савецкіх грамадзян. У Сумбэйскім лягеры знаходзіцца ў зьняволеньні 1.161 савецкіх грамадзян, з іх 16 дзяцей, ня лічачы арыштаваных, якія пераведзены ў лягер з клюбу майстэрняў УК чыгункі.

У турме знаходзіцца 82 чалавекі, з іх 6 жанчын, у памяшканьні харбінскага штабу — 8 чалавек. Звыш 35 чалавек былі катаваны. Памерлых ад ран і біцьця—3, высланых—354, загінула без весьці—26, забітых на каляіне УК чыгункі—5. Колькасьць зьбіваных не паддаецца вучоту.

Новыя арышты.

ТОКІЁ, 29-9. З Харбіну паведамляюць: на станцыі Бухэду арыштаваны без указаньня прычын былы супрацоўнік савецкага консульства ў Харбіне, які быў пакінуты са згоды кітайскай улады на дапамогу нямецкаму консульству дзеля раздачы дапамогі савецкім грамадзянам.

Дастаўленыя ў Харбін са ст. Манчжурыя 69 савецкіх грамадзян пасаджаны ў мясцовую турму. З іншых станцый прывезена яшчэ 12 савецкіх грамадзян.

Патрабуюць уладжаньня канфлікту.

ПЕЙПІН. Агенцтва Сімбун-Рэнго паведамляе з Нанкіну, што Чжан-Сюэ-Лян паведаміў нанкінскі ўрад аб неабходнасьці хутчэйшага ўладжаньня канфлікту з СССР і патрабаваў назначыць Велінгтона-Ку міністрам замежных спраў узамен Ван-Чжэн-Ціна.

НЯМЕЦКІ КОНСУЛ НАВЕДАЎ КІТАЙСКІХ ГРАМАДЗЯН У ЧЫЦЕ.

ЧЫТА, 28-9. Нямецкі консул ва Уладывастоку Бальзэр, які наведаў Чыту, выехаў у Благавешчанск. Консул пабываў у Чыце на дзяржаўным лесапільным заводзе, дзе на працы заняты кітайцы, а таксама ў цэлым шэрагу савецкіх установ і музэі рэвалюцыі.

Аб наведваньні папраўчага працдому, дзе трымаюцца кітайскія грамадзяне, арыштаваныя за розныя злачынствы, пан Бальзэр заявіў наступнае: «Чыцінская акруга ўваходзіць у межы консулату, а таму я прыехаў сюды пазнаёміцца з мясцовай уладай і разам з экономікай акругі. У сувязі з канфліктам на УК чыгунцы абарона інтарэсаў кітайскіх грамадзян даручана нямецкім консульствам. З прычыны гэтага я пабываў у папраўчых дамах арыштаваных кітайцаў. Пастаноўка работы ў папраўчым працдоме, арганізацыя працы і выхаваўчая частка заслугоўваюць увагі. Кідаецца ў вочы чыстата, адсутнасьць згрувашчанасьці і пастаноўка абслугоўваньня.

Консул агледзеў майстэрні і кухні ўнутры папраўчага працдому, дзе кітайцы працуюць разам з расейцамі. Добра ведаючы кітайскую мову, пан Бальзэр гаварыў з арыштаванымі на роднай мове. Ніякіх скаргаў на ўціск не паступала.

У заключэньне консул паведаміў, што наведае ў Срэценску магілкі вайскова-палонных вайны 1914-19 г. г. і паставіць помнік, на што ўрад Нямеччыны асыгнаваў сродкі».

НА ПАРОЗЕ НОВАГА ГАСПАДАРЧАГА ГОДУ.

Вынікі мінулага гаспадарчага году і кантрольныя лічбы, якія намечаны на 1929-30 год, без лішніх слоў пацьвярджаюць той асноўны факт, што наша сацыялістычнае будаўніцтва ўступіла ў фазу таго паскораньня, аб якім мы ў першыя гады НЭП'у маглі толькі марыць, але якое было прадказана Леніным, як няўхільны вынік удзельнае вагі сацыялістычнага сэктару нашае гаспадаркі. На фоне 100 процантнага, у сярэднім, выкананьня вызначанага гаспадарчага пляну мінулага году мы бачым выразна вядучую ролю буйнай прамысловасьці і калектыўных форм сельскае гаспадаркі, якія далі значнае павышэньне вызначаных тэмпаў. 24 проц. росту замест 21,4 проц. па буйнай прамысловасьці і 207,1 проц. павялічэньня пасеўнай плошчы калгасаў замест меркаваных 94,1 проц.—ці патрэбны яшчэ доказы, што сацыялістычныя элемэнты нашай экономікі робяцца на практыцы рашучым рухавіком паскораньня тэмпу нашага гаспадарчага разьвіцьця, асноўным сродкам ажыцьцяўленьня задачы „дагнаць і перагнаць“ капіталістычныя краіны? Якімі далёкімі ад жыцьця здаюцца ў сьвятле гэтых фактаў палахлівыя „перасьцярогі“ прадстаўнікоў правага ўхілу, іх варожба наконт таго, што прыдзецца згортваць намечаныя тэмпы індустрыялізацыі, тармазіць разгортваньне калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Жыцьцё бязьлітасна адкінула хвасьцісцкую ўстаноўку эканамістаў, якія пішуць у габінэтнай цішы свае няўдалыя заметкі і шчыльна надвяло нашу партыю да неабходнасьці яшчэ большага паскораньня тэмпаў будаўніцтва, яшчэ большага скарачэньня тэрмінаў. Плянавае меркаваньне на новы 1929-30 гаспадарчы год адбівае ў сабе гэтыя настойлівыя патрабаваньні жыцьця. 3-мільярднае капітальнае ўкладаньне, 33-х процантны рост прамысловасьці, новы гіганцкі ўзьлёт калектывізацыі на вёсцы—гэткія асноўныя рысы гэтых плянавых меркаваньняў на новы гаспадарчы год. Зьяўляючыся плянам разгортваньня сацыялістычнага наступу, наш гаспадарчы плян, натуральна, усё больш заяўляе сябе як плян наступовай індустрыялізацыі краіны.

Кантрольныя лічбы на 1929-30 г. намячаюць асабліва высокія тэмпы ў галіне зрыхтаваньня сродкаў вытворчасьці, дзе ранейшыя наметкі пяцігодкі адступаюць рэзка назад у параўнаньні з заданьнем будучага году. Асабліва значнае перавышэньне першапачатковых наметак падае на галіну будаваньня трактараў, будаваньня с.-г. машын, інакш кажучы, на галіну падвядзеньня сталай тэхнічнай базы пад аграмаджаньне сельскае гаспадаркі, якое буйна расьце.

Новыя вытворчыя формы сувязі паміж горадам і вёскай, рост непасрэднага ўзьдзейнічаньня індустрыі на сельскую гаспадарку, простая перабудова адсталай вясковай тэхнікі пралетарскімі трактарнымі калёнамі, масавая калектывізацыя,—гэткі сапраўдны шлях нашага разьвіцьця.

Рацыяналізацыя вытворчасьці і зьніжэньне сабекошту, падвышэньне прадукцыйнасьці працы на падставе ўсё больш глыбокага ўкарaненьня ў патрэбы нашай вытворчасьці пачаткаў сацыялістычнага спаборніцтва і дысцыпліны працы, паляпшэньне якасьці самой прадукцыі шляхам рацыянальнага выкарыстаньня заваёў індустрыяльнай навукі і тэхнікі,—гэткія абавязковыя ўмовы, без якіх сыстэматычнае і няўхільнае нарастаньне тэмпу сацыялістычнага наступленьня немагчыма.

Самая лютая і жорсткая барацьба павінна быць тут абвешчана руціне, фармалізму, каштарысністасьці, цэхавай абмежаванасьці, якія становяцца на шляху сацыялістычнага наступленьня, што зараз разгортваецца. Асноўнай прадпасылкай выкананьня гаспадарчых задач наступнага году зьяўляецца поўная згуртаванасьць і адзінства партыі ў справе ажыцьцяўленьня генэральнай ленінскай лініі ў гаспадарчым будаўніцтве і цьвёрдая нясупынная барацьба з права-апартуністычным ухілам, які спрабуе дэзарганізаваць разгортваньне сацыялістычнага наступленьня.

«Правда».

Аўстрыя мае выгляд ваеннага лягеру.

ВЕНА, 30-9. Учарашнія 4 працэсіі хэймвэру прайшлі пад знакам „салідарнасьці Шобэра з хэймвэрам. Сацыял-дэмакраты распылілі масы, арганізаваўшы 700 сходаў па ўсёй Ніжняй Аўстрыі. Паміж хэймвэрамі, паліцыяй і рэспубліканскім „шуц-бундам“ была дасягнута згода ў сэнсе падтрыманьня парадку ва ўласных шэрагах. У гарадок, які разьмешчаны наваколле Вены, асабліва ў пралетарскім Мэдлігу, куды накіраваліся галоўныя калёны хэймвэру, узброеных сіл было столькі, што горад здаваўся вайсковым лягерам. З прычыны гэтага значных сутычак ня было.

Мерапрыёмствы паліцыі былі накіраваны, галоўным чынам, супроць камуністаў, якія адкрыта выступілі супроць фашыстаў. У Мэдлігу сход хэймвэраў, у колькасьці 6 тысяч чалавек, вітаў галаву ўраду Ніжняй Аўстрыі, які падкрэсьліў, што ён цалкам на баку хэймвэру. Лідэры хэймвэраў падкрэсьлілі ў сваіх прамовах салідарнасьць хэймвэру з урадам і заявілі, што воля хэймвэру павінна быць ажыцьцёўлена парлямантам на „хур'ерскіх“. „Хто спрабуе супроцьстаць батальёнам хэймвэраў,—заявіў лідэр хэймвэраў Штэйдле,—будзе растаптаны“. З аналёгічнымі прамовамі выступалі [illegible] іншых мясцок.

Генэральная чыстка зробіць партыю яшчэ больш згуртаванай і баяздольнай

На першы сход па чыстцы ячэйкі Наркамгандлю члены ячэйкі і беспартыйныя не зьявіліся. У ячэйцы КП(б)Б мэталёўцаў выкрыты склокі. У ячэйцы працаўнікоў асьветы нізкі палітычны ўзровень.

ЗАМЕСТ ВЫЧЫШЧАНЫХ---ЛЕПШЫХ ПРАЛЕТАРЫЯЎ, БАТРАКОЎ І БЕДНЯКОЎ У ПАРТЫЮ.

Чыстка выкрывае шмат недахватаў.

(Ячэйка мэталёўцаў, г. Менск).

Ячэйка мэталёўцаў аб'ядвае Белмэталётрэст, ДЭТ, Рудмэталягандаль, Мэталюргічны сындыкат і машынна-тэхнічны сындыкат. Гэта акалічнасьць выклікала тыя спэцыфічныя ўмовы працы, аб якіх шмат гаворыцца на чыстцы ячэйкі, якая пачалася 26-га верасьня ў клюбе заводу „Камунар“.

Падрыхтоўчая праца да чысткі была недастатковая. На першым сходзе амаль ніхто з беспартыйных не выказаўся па дакладу сэкратара ячэйкі і толькі на другім сходзе, пасьля адпаведнай „апрацоўкі“ беспартыйных супрацоўнікаў, апошнія пачалі выказвацца, ускрываючы факты бюракратызму і безгаспадарнасьці з боку кіраўнікоў установаў і хібы асобных партыйцаў.

Ня гледзячы на тое, што выдзеленая рабочая брыгада заводу „Камунар“ абмежавалася ў сваёй працы толькі праглядам пратаколаў бюро і сходаў ячэйкі, сябры партыі і беспартыйныя рабочыя заводу ўзялі актыўны ўдзел у чыстцы.

Адносна кожнага правяраемага выказваюцца па 10—15 чал., якія на працягу 1—2 гадзін падрабязна абгаварваюць кожнага партыйца.

Самы буйны калектыў аб'яднаны ячэйкай—гэта калектыў ДЭТ, які доўгі час займаўся склокай. Сьмірноў, Крывапосаў і Інбэрг—партыйцы—вось цэнтральныя асобы гэтых склок.

„Адказныя“ з ДЭТ'у езьдзілі на кастролі па раёнах, а кіраўнік т. Караташ нават дадумаўся да паездкі ў Смаленск для таго, каб пазнаёміцца з загадчыкам Смаленскага аддзяленьня. Гэты-ж Караташ даручыў машыністцы рэгістраваць усе памылкі Сьмірнова, калі апошні быў пазначан загадчыкам агульнага аддзелу.

Былі выпадкі зажыму самакрытыкі. Калі рабочы манцёр т. Казлоў зьвярнуў увагу т. Караташа на тое, што па нантажы безгаспадарчасьць і неабходна прыняць адпаведныя меры, … адказаў: ты мусіш … крычаў, … (стар… інакш выжыве вучані… За камсамолку Савіч са складу, якая „асьмелілася“ паставіць на бюро ячэйкі пытаньне аб шурыне Інбэрга, які працаваў на гэтым складзе пакавальшчыкам і быў прыняты як «спэцыяліст па пакаваньню мармуру», якім ён ніколі ня быў.

Калі служачы Рудмэталёгандлю т. Олькес заявіў загадчыку аддзелу пеліквідаў—Марозаву аб шэрагу недахопаў у працы ўстановы, апошні яму адказаў «можаце расьпісацца і атрымаць разьлік».

Усе гэтыя факты высьветліліся ў выніку шырокай актыўнай крытыкі ўсіх прысутнічаючых.

Шэфская праца над вёскай і Чырвонай арміяй была пастаўлена дрэнна. Праца вялася ад здарэньня да здарэньня. У падшэфнай вёсцы былі ўзяты 100 руб. на ўстаноўку радыё, але прыёмнік ня толькі не ўстанавілі, а нават грошы выдалі на іншыя мэты. І засталася вёска і бяз радыё і бяз грошай. Прысутныя на чыстцы чырвонаармейцы падшэфнікі „крылі“ за дрэнную сувязь з імі і адсутнасьць якой колечы працы.

Толькі камсамольская ячэйка цесна зьвязана з падшэфнікамі і трымае гэту сувязь.

Пасланыя для працы на электрастанцыі вёсак некалькі манцёраў разлажыліся там і п'янствавалі. Сярод іх быў член партыі.

Беларусізацыя праведзена толькі ў Белмэталётрэсьце і часткова ў іншых установаў. Але ўся беларусізацыя „папяровая“. На сходах рэдка пачуеш беларускую мову і нават сэкратар ячэйкі т. Любамірскі даваў справаздачу ячэйцы на чыстцы па расейскай мове.

Насьценгазэты ў большасьці пішуцца на расейскай мове і рэдкалегія ДЭТ нават „умудраецца“ да заметак на беларускай мове даваць дапіскі ад рэдакцыі на расейскай мове. На праверку ведаў беларускай мовы зьявіліся не 3-4 партыйцы з … пагава… Сацыялістычн…рніцтве, але справа захола ў самым пачатку.

Так крок за крокам выкрываюцца дрэнныя бакі як ўсёй ячэйкі, так і паасобных яе членаў.

М. і Ц.

СЛАБАЯ ПАЛІТПІСЬМЕННАСЬЦЬ.

Ячэйка КП(б)Б народнага харчаваньня складаецца з 22 членаў партыі. Трэба адзначыць, што ўмовы працы ячэйкі цяжкія. Ячэйка КПБ аддала максымум увагі антырэлігійнай працы і ў выніку ў сучасны момант ячэйка нар. харч. мае 280 чалавек бязбожнікаў.

Ёсьць і адмоўныя бакі ў працы ячэйкі. Ячэйка слаба кіравала гаспадарчаю працаю, ячэйка ня цікавілася працаю ячэйкі камсамолу, надзвычайна дрэнна працуюць ячэйкі Асоавіяхіму і Мопр'у. Некаторыя партыйцы займаліся п'янкамі. Ячэйка не рабіла праверку выкананьня нагрузак, ня знала добра членаў партыі. Калі патрэбна было даць члену партыі 1926 году характарыстыку, то ячэйка не змагла даць яе, бо яна ня ведала гэтага члена ячэйкі.

Цікавы тып член ячэйкі Вялікаселец які захоўваў ад камісіі сваё мінулае і толькі дзякуючы пытаньням выяўлена, што т. Вялікаселец працаваўшы на чыгунцы служыў у Калчака, у чэхаў і г. д.

Трэба адзначыць, што палітычны ўзровень партыйцаў надзвычайна нізкі. Цікава тое, што напрыклад, Коўшын член партыі з 1922 году ня ведае, што такое правы ўхіл. Гардзіна член партыі 1920 году, жанчына, была ў радох Чырвонай арміі, рабочы стаж мае 18 год, а ў сучасны момант ня можа разабрацца ні ў адным палітычным пытаньні.

Трэба адзначыць, што хатнія працаўніцы актыўна ўдзельнічаюць у чыстцы парт. ячэйкі.

Лапша.

Ёсьць плюсы, а мінусаў больш.

(Ячэйка працасьветы, г. Менск).

Сёмы дзень ідзе чыстка ячэйкі КП(б)Б працасьветы. Ячэйка вялікая, налічвае 76 членаў і кандыдатаў партыі. Ячэйка аб'ядвае партыйцаў, якія працуюць у розных культасьветных установах г. Менску: ЦП саюзу працасьветы, АІНА, школах, дзіцячых дамох і садох і г. д. Чыстка праходзіць пры заўжды перапоўненай залі. На сходах чысткі прысутнічае іншы раз да 500 чалавек беспартыйных асьветнікаў.

Па справаздачы бюро ячэйкі выказалася каля 50 чалавек партыйцаў і беспартыйных. Як у часе абгаварэньня дакладу бюро ячэйкі, так і ў самым працэсе ходу чысткі заўважаецца значная актыўнасьць. На кожнай кандыдатуры, якая мала-мальскі выклікае сумненьне разгортваюцца вялікія спрэчкі.

Трэба адзначыць, што ўмовы працы ячэйкі вельмі цяжкія і … [illegible] раскіданы па аднаму—два на гэтых установах, культурны фронт зьяўляецца такім вучасткам нашага сацыялістычнага будаўніцтва, які асабліва небясьпечны ў справе пранікнаваньня розных варожых дробна-буржуазных ідэалёгій, вось чаму на сходах чысткі актыўнічае маса, выяўляючы ўсе недахваты як у працы ячэйкі, так і ў працы кожнага партыйца паасобку.

Ячэйка мае ў сваёй працы рад дасягненьняў: ячэйка ўзьняла свой аўтарытэт сярод беспартыйнай масы, вырас вакол ячэйкі актыў, разгортваецца грамадзкая праца асьветнікаў у Чырвонай арміі, на заводах і фабрыках, ячэйка вяла рашучае змаганьне з усялякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, даючы заўжды адпор усім тым, хто імкнуўся навязаць ячэйцы трацкісцкія тэорыі, ці права-апартуністычную практыку. Ячэйка ня дрэнна правяла рад гаспадарча-палітычных кампаній, мабілізуючы масы вакол задач гэтых кампаній.

Аднак, калі прааналізаваць належным чынам працу ячэйкі, то можна заўважыць яшчэ больш недахопаў, чым дасягненьняў. У ячэйцы значная колькасьць членаў партыі і кандыдатаў з вышэйшаю асьветаю, наогул агульнаасьветны ўзровень ячэйкі досыць высокі, але за тое палітычная пісьменнасьць стаіць на надзвычайна нізкім узроўні. Чыстка выявіла, што паасобныя партыйцы, якія маюць вышэйшую асьвету, ня могуць адказаць нават на такое запытаньне: чаму наша партыя называецца камуністычнаю.

Другі адмоўны момант, які кідаецца ў вочы—гэта слабое разгортваньне самакрытыкі, асабліва сярод беспартыйнай масы.

Трэцьці адмоўны момант — гэта склокі ў ячэйцы. Праўда, назіраюцца склокі сярод паасобных партыйцаў, аднак яны ёсьць. Гэта таксама вельмі значны мінус у працы ячэйкі, тым больш ячэйкі працасьветы.

Я. Мац.

Першы праверачны сход сарваны

(Ячэйка Наркамгандлю, горад Менск).

30 верасьня павінен быў адбыцца першы праверачны сход ячэйкі Наркамгандлю, але ў 7 гадзін, калі сход павінен ужо пачацца ў клюбе харчавікоў, былі толькі праверачная камісія, адзін таварыш з ячэйкі абойнай фабрыкі, якая прымацавана на час праверкі і загадчык клюбу, руплівы прыбіраючы клюб.

Праз паўтары гадзіны нуднага чаканьня заля ўсё-ж была пустой за выключэньнем двух дзесяткаў і партыйных і беспартыйных са ўсіх ячэяк і ўстаноў, якія павінны былі ўдзельнічаць у чыстцы ячэйкі Наркамгандлю.

Пры такіх абставінах распачынаць чыстку савецкай ячэйкі немагчыма было і праверачная камісія змушана была першы сход адкласьці на другі дзень.

Ці можна пасьля гэтага сказаць, што ўсе ўстановы Наркамгандлю разгарнулі самакрытыку, ці можна сказаць, што ячэйка Наркамгандлю рыхтавалася да чысткі.

Выпадак з першым сходам гаворыць аб адваротным, ён наводзіць нас на думку аб тым, што ячэйка, баючыся самакрытыкі, выходзячай з шырокіх мас, не хацела і не рыхтавала іх да чысткі, магчыма і не паведаміла шырока аб дні і гадзіне чысткі.

У кожным выпадку тое, што на праверачны сход ячэйкі ня прышлі ня толькі беспартыйныя масы і камсамольцы, але і ня ўсе камуністы, сьведчыць аб нейкім надзвычайна нездаровым зьявішчы, якое патрабуе ад праверкому дэталёвага вывучэньня гэтага факту пры агульнай ацэнцы работы ячэйкі Наркамгандлю. Зрыў праверачнага сходу—гэта сур'ёзная справа.

Час для выпраўленьня памылкі ёсьць, пабачым, як ячэйка Наркамгандлю гэта зробіць.

Я. Ч.

Замест вычышчаных уступаюць у партыю лепшыя рабочыя і вясковая бедната.

Вясковыя райпартарганізацыі Менскай акругі падвялі вынікі працы па праверцы і чыстцы вясковых партячэек. Кожнай арганізацыяй адзначаецца вялікая палітычная значнасьць гэтай працы і яе станоўчыя вынікі ў справе ўзмацненьня працаздольнасьці вясковых ячэек па ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі ў вёсцы, у справе узмацненьня іх аўтарытэту сярод батрацкай і бядняцка-серадняцкай часткі сялянства і яшчэ большага набліжэньня да ячэек гэтых пластоў вясковага насельніцтва.

Праца па праверцы і чыстцы вясковых ячэек была шчыльна ўвязана з задачамі ўцягненьня ў партыю лепшай часткі батрацтва і сельска-гаспадарчых рабочых. У часе чысткі амаль у кожнай ячэйцы падаваліся заявы батракамі, с.-гасп. рабочымі, беднякамі аб прыёме іх у партыю. Такіх заяў толькі па 11 раёнах падана 450 а па ўсёй акрузе больш 600.

Зьмест гэтых заяў, напісаных у большасьці выпадкаў поўграматна, мазолыстай рукой вясковага пралетарыя, батрака ці бедняка, яскрава сьведчыць іх клясавую адданасьць камуністычнай партыі і шчырае жаданьне чэстна працаваць у шэрагах партыі, змагацца за канчатковую пабудову сацыялізму. Якасны склад нова прымаемых у партыю паступова паляпшаецца. Лік прынятых у партыю с.-гасп. рабочых і батракоў за другі квартал гэтага году ў параўнаньні з першым кварталам павялічыўся на 76 проц.

Але невыстарчальны яшчэ рост значна ліку вясковых партячэек за лік батрацтва і сельск.-гасп. рабочых падцьвярджаецца шэрагам фактаў. Напрыклад, Самахвалавіцкай партарганізацыяй, дзе маецца 1800 батракоў і 670 с.-гасп. рабочых, прынята ў партыю за 11 месяцаў толькі 12 чал. з гэтай групы. Пухавіцкай арганізацыяй прынята толькі 12 с.-гасп. рабочых і 4 батракі з агульнага ліку 937 батракоў і больш 200 ч. с.-г. рабочых. Плешчаніцкай арганізацыяй за 9 месяцаў прынята толькі 9 батракоў, у той час калі іх маецца ў раёне 853 чал. Такое невыстарчальнае становішча ў гэтай галіне працы мае месца і ў радзе др. раёнаў.

Як відаць з гэтых лічбаў да пачатку праверкі і чысткі вясковых партячэек раённыя партарганізацыі прымалі ў партыю ў сярэднім за месяц толькі па аднаму батраку ці с.-гасп. рабочаму. Гэткая невыстарчальнасьць тлумачыцца выключна слабай працаю вясковых партячэяк, асабліва сярод батрацтва.

Патрэбна вясковым ячэйкам працу ў гэтым напрамку ўсямерна ўзмацняць і пашыраць, канчаткова ліквідаваўшы шкадлівыя, беспадстаўныя настроі: „няма за лік каго расьці“.

На жаль, такія беспадстаўныя настроі маюць месца ня толькі ў вясковых ячэйках, але нават і ў вытворчых. Праведзеным абсьледваньнем росту ячэйкі ф-кі „Рабочы“—у Барысаве, якая з 1 кастрычніка 1928 г. па 1 чэрвеня г. г. прыняла ў партыю толькі 1 чал., сьведчыць, што працы ячэйка у гэтым напрамку амаль ніякай не вяла. З 10 праведзеных за гэты час сходаў ячэйкі—7 было зачыненых. Рост ячэйкі затрымоўваўся ня толькі па прычынах вельмі слабай яе працы, але яшчэ і таму, што ў складзе яе маюцца такія асобы з партбілетамі, якія адкідалі ад ячэйкі беспартыйных рабочых. Напрыклад, адзін рабочы зьвяртаецца да камуніста за парадаю—як уступіць у партыю, а ён раіць: „ня варта, я сам думаю выходзіць з партыі“.

Яч. ф-кі „Чырвоная Бярэзіна“ хаця вырасла за гэты час на 22 чал., але прыём ў партыю прыурочваўся толькі к такім дням, як дзень сьмерці Леніна, 8-га сакавіка, а сыстэматычнай працы па ўцягненьню ў партыю рабочых ад варштату ня было. І эты рост праходзіў самацёкам.

У абедзьвох у гэтых ячэйках замест актыўнай працы былі разважаньні: „няма асабліва за лік каго расьці“.

Адбыўшыяся адчыненыя сходы гарадзкіх партарганізацый у Менску і Барысаве з масавым удзелам беспартыйных рабочых, прысьвечаныя „Міжнароднаму Чырвонаму Дню“, паказалі вялікую цягу ў партыю рабочых ад варштату. На гэтых сходах падана рабочымі 618 заяў з жаданьнем іх уступіць у партыю, з якіх значная колькасьць маюць 15-20-гадовы вытворчы стаж. Наяўнасьць сотняў рабочых з вялікім вытворчым стажам на кожным буйнейшым прадпрыемстве, пры належнай пастаноўцы працы вытворчых ячэек дасьць з іх лепшую перадавую частку новых членаў партыі.

Праверка і чыстка вытворчых ячэек яшчэ больш спрыяе далейшаму ўцягненьню ў партыю лепшай часткі пралетарыяту. Даную дырэктыву XII-м зьезду КП(б)Б, каб да канца 1930 году давесьці склад КП(б)Б да 50 проц. рабочых ад варштату, с.-гасп. рабочых і батракоў выканаем з посьпехам. Усе магчымасьці для гэтага маюцца.

Я. І-н.

СЫГНАЛІЗУЕМ ТРЫВОГУ.

Хлебазагатоўкі на Магілёўшчыне праходзяць самацёкам. Плян выкананьня пад пагрозай зрыву. Трэба ўдарыць па праступных і бюракратычных адносінах з боку загатоўшчыкаў да выкананьня плянаў.

ВЫКАНАНЬНЕ ГАДОВАГА ПЛЯНУ.

З боку кіруючых акруговых устаноў—акругкому КП(б)Б і АВК пытаньне аб хлебазагатоўках было ўзьнята сваечасова, была праведзена належная падрыхтоўчая праца як сярод загатавіцеляў, гэтак і сярод працоўных мас Магілеўскай акругі, але загатоўчыя органы сумесна з сваім загатоўчым апаратам палічылі за лепшае адпачываць, агарадзіўшыся моцнай сьцяной бюракратычных і праступных адносін да хлебазагатовак.

Па акрузе гадавы плян хлебанарыхтовак вызначаны ў колькасьці 8137,2 тоны.

Пры належнай увазе і стараннасьці з боку загатоўчых арганізацый, гэты плян можна было-б выканаць, а пры адсутнасьці ў загатавіцеляў памянёных асаблівасьцяў гадавы плян выкананы на 20-е верасьня—7,3 проц., ці інакш, загатоўлена—596,9 тоны.

У першым квартале трэба было загатовіць 1579 тон, а загатоўлена як бачыце значна менш (596,9 тоны)—37,7 проц. заданьня.

Выкананьне заданьня калектыўнымі гаспадаркамі і заданьня па памольнаму збору—таксама праходзіць марудна. Калгасы выканалі 70 проц. квартальнага заданьня, а памольны збор выкананы на 8,7 проц. гадавога заданьня, ці 42,6 проц. квартальнага.

Зусім слаба абстаіць справа з спаганьнем закантрактаванага збожжа. З належачых 1810 тон, атрымана на 20-е верасьня 30,8 тон, альбо 1,6 пр.

НІХТО НЕ КЛАПАЦІЎСЯ АБ ЗАГАТОЎКАХ.

Да такога катастрафічнага становішча справу загатовак давяла ня толькі злачынная нядбайнасьць загатоўчых органаў, а таксама і няўважлівасьць з боку некаторых установаў і арганізацый.

Пляны аб загатоўках у сельсаветах не абгаварваліся, ня ставіліся на сходах бедняты. Агулам кажучы, ніводная з установаў не паклапацілася згуртаваць грамадзкай думкі вакол гэтай важнай кампаніі. Усе спадзяюцца на самацёк.

У нас ёсьць факты, калі ня толькі ў сельсаветах, але і ў раёнах пляны хлебазагатовак бяз усялякіх меркаваньняў, не прачытаныя, кладліся пад сукно.

Канчаткова плян хлебазагатовак Магілеўскі АВК разаслаў у раёны 29 жніўня, а ў Крычаўскім раёне ніхто і ня ведаў, што гэтакі плян калі-небудзь быў і толькі 24 верасьня, дзякуючы старанасьці загадчыка акраддзяленьнем камунгандлю ўдалося гэты плян знайсьці. Ён спакойна, роўненька зложаны, бяз усякіх рэзалюцый, бяз нічога „адпачываў“ між непатрэбных паперак.

Крычаўскі раён не адзін, да яго можна далучыць Клімавіцкі і Шклоўскі раёны.

ХЛЕБ ПРЫМАЮЦЬ «АКУРАТНА».

Мала таго, што загатавіцелі самі ня цікавяцца справай загатовак, дык некаторыя з іх яшчэ перашкаджаюць здаваць хлеб.

У Быхаў 15 верасьня прыбыў чырвоны абоз у складзе 70 фурманак. Быў выхадны дзень, благое надвор'е, і людзі прымушаны былі чакаць цэлыя суткі, каб здаць прывезеныя сотні пудоў хлеба.

У Магілеўскім хлебсаюзе справы абстаяць ня лепш. Злачынны бюракратызм пануе і тут.

Аднойчы з Чавускага раёну на 7 фурманках сяляне прывезьлі памольны збор. Быў выхадны дзень. Загадчык і ўвесь апарат ведалі аб гэтым, але ніхто не паклапаціўся, каб прыняць збожжа.

Сяляне чакалі і ўрэшце пайшлі ў АВК, які ў катэгарычнай форме прапанаваў прыняць хлеб.

Загадчык заводу „Зара“, мала таго, што адмовіўся прыняць ільно семя ад селяніна, які прыехаў спэцыяльна з Журавіцкага раёну, але пратрымаў яго цэлыя суткі пры благім надвор'і, і на просьбы прыняць ільно семя, загадчык пачаў жартаваць:

„Чаму няма ў цябе брэзэнту?.. Чаму ты куды небудзь не заехаў (можа да прыватніка? Б.)?..“

Селянін на другія суткі змог здаць семя ў хлебсаюз і то пры дапамозе АВК.

Да ўсяго гэтага трэба сказаць некалькі слоў аб прэміравальным фондзе.

„Дняпросаюз“ і ня думае відаць аб тым, каб забясьпечыць нізоўкі патрэбнымі матар'яламі для прэміраваньня, а на Клімавіцкай базе, калі і ёсьць матар'ял і ёсьць, дык ён ляжыць нерухомы, нікому не раздаецца.

Трэба зараз-жа паклапаціцца аб тым, а таксама і аб ссыпных пунктах, складах, бо ў некаторых раёнах ужо няма месца дзе ссыпаць збожжа.

У Крычаўскі раён, напрыклад, гэтымі днямі прыбудзе 4500 пудоў хлеба, але памяшканьня няма, і ня ведаюць у некаторых мясцох, куды падзець загатоўлены хлеб, ніякіх аб гэтым загадаў і паведамленьняў.

Пералічаныя тут факты не адзінкавыя. Трэба зараз-жа ўдарыць з усёй рашучасьцю па іх, трэба разварушыць гэты бюракратычны хлебазагатоўчы апарат на Магілеўшчыне, пасунуць уперад выкананьне хлебазагатовак тым больш, што бядняцка-серадняцкая маса сама чырвонымі абозамі вязе хлеб у каапэрацыю, ураджай на Магілеўшчыне гэтага году дасьць на мільёны з лішнім больш, чым у мінулы год.

Блізкі.

Трацкісцкія і правыя рэнэгаты і канфлікт на Усходня-Кітайскай чыгунцы

Падзеі на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы выклікалі вельмі жывую рэакцыю з боку адкідаў камуністычнага руху, з якіх Троцкі спрабуе арганізаваць „міжнародную левую камуністычную апазыцыю».

«Ды Фанэ дэс Камунізмус», орган «артадаксальных марксыстаў-ленінцаў», узьняў па гэтым пытаньні „дыскусію“ і ў першым-жа артыкуле, пад лёзунгам „Рукі прэч ад Расеі—рукі прэч ад Кітаю!“, стаў цалкам на бок кітайскіх захопнікаў-правакатараў.

Адкрытае выступленьне аўтараў „дыскусійных“ артыкулаў у органе нямецкага „Ленінбунда“ супроць СССР і за Чан-Кай-Шы і яшчэ больш перадавіца ў тым-жа духу ў органе цэнтральнай трацкісцкай групы ў Францыі «Контр ле Куран» змусілі самога Троцкага выступіць з «дырэктыўным» артыкулам на старонках «Ды Фанэ дэс Камунізмус».

Троцкі пачынае з апісаньня інтэрв'ю, дадзенага ім «амэрыканскай агентуры друку», заключны абзац якога гаворыць: «Я не павінен асобна заявіць, што ў выпадку, калі-б **Савецкаму Саюзу** была навязана вайна, апазіцыя цалкам аддалася-б абароне **Кастрычнікавай рэвалюцыі**“.

Сэнс гэтага сказу, зрэдагаванага ў характэрным для пазіцыі Троцкага сьціплым стылі, заключаецца ў супроцьпастаўленьні Савецкаму Саюзу—Кастрычнікавай рэвалюцыі. Лічачы, аднак, што неяк нязручна ў сучасны момант перад тварам заходня-эўрапейскіх рабочых выказаць адкрыта і да канца гэту сваю думку, Троцкі паўстае супроць тых з сваіх прыхільнікаў, якія, адкінуўшы яго гнілую дыпламатыю, занялі выразна-варожую ў адносінах да самога Саюзу пазіцыю.

— «Я думаў,—піша Троцкі,—што я ў гэтых словах (пададзены абзац інтэрв'ю—Г. В.) выказваю бясспрэчную думку **усёй левай камуністычнай апазіцыі**. На справе-ж гэта выйшла ня так. Унутры гэтай апазіцыі аказаліся элементы і групы, **якія пры першым сур'ёзным выпрабаваньні** занялі пазіцыю альбо няпэўную, альбо ў корані фальшывую, якая **супроцьставіць іх рэвалюцыйнаму лягеру апазіцыі і надзвычайна набліжае іх да лягеру сацыял-дэмакратыі**“.

„Рэдакцыя „Ды Фанэ дэс Камунізмус“ надрукавала артыкул—далей піша Троцкі—«які бачыць прычыну канфлікту ў парушэньні права на самавызваленьне Кітаю Савецкай Рэспублікай, г. зн., што яна бярэ на сутнасьці на сябе абарону Чан-Кай-шы». „Застаецца зусім незразумелым, як можна ўзьнімаць дыскусію па такому элементарнаму для кожнага рэвалюцыянэра пытаньню, пры гэтым у момант, калі неабходна палітычнае дзеяньне... Нешта непараўнальна горшае здарылася(!) з адной з шматлікіх груп францускай апазіцыі. У № 35 (ад 28 ліпеня) часопісі «Контр ле Куран» савецка-кітайскаму канфлікту прысьвечан перадавы артыкул, які зьмяшчае ад пачатку да канца шэраг памылак, **напалову сацыял-дэмакратычных, напалову ультра-левых...** Гэты артыкул ставіць аўтара ў няпрымірымую супярэчнасьць **да ўсёй левай камуністычнай апазіцыі**».

— Праўда,—заяўляе Троцкі,—„сталінская бюракратыя нясе адказнасьць за цяперашні канфлікт у тым сэнсе, што яна дапамагала Чан-Кай-шы разграміць рэвалюцыю кітайскіх рабочых і сялян». Праўда, СССР коціцца да тэрмідора; але „калі нельга сказаць, што тэрмідор закончан, дык таксама нельга сказаць, што палітыка савецкай дзяржавы капіталістычная ці імпэрыялістычная“. «Якія вывады мы робім з гэтага? Тыя, што ня трэба абараняць савецкай рэспублікі? Або тыя, што трэба яе вызваліць ад сталінскага кіраўніцтва? Перадавы артыкул «Контр ле Куран» злачынна схіляецца да першага вываду. Ён заяўляе, што яна ня можа стаць на бок сталінскай бюракратыі і яе злачыннай вайны. Як быццам у выпадку вайны справа была ў сталінскай бюракратыі, а не ў Кастрычнікавай рэвалюцыі і ў **закладзеных у ёй магчымасьцях**“.

І Троцкі заканчвае спасылкай на сваё выступленьне на ліпнёўскім пленуме ЦК і ЦКК 1927 г. у адказ на кінутае яму і яго прыхільнікам—у сувязі з яго „клемансоцкімі“ перспэктывамі ў выпадку вайны—абвінавачаньне ў паражэнцтве і тэорыі „умоўнай абароны“ Саюзу.

Троцкі спрабуе выступаць ад імя „усёй левай камуністычнай апазіцыі“ і абвінавачваць у „ухіле“ толькі некаторыя „элементы і групы“. Аднак, гэту яго прэтэнзію дэзавуіравала у тым-жа нумары рэдакцыя органу «Ленінбунда». Папершае, перадрукаваўшы тут-жа сьледам за артыкулам Троцкага і ў тым-жа „дыскусійным“ парадку артыкул Лузона («Спадчына цара ці Леніна? Адзінае рэвалюцыйнае рашэньне: Усходня-Кітайскую чыгунку вярнуць кітайцам!»), які зьвіўся адначасова, як кіруючы перадавы артыкул у органе другой францускай трацкісцкай групы «Рэвалюсьён Пралетар'ен» і ў органе бэльгійскай трацкісцкай апазіцыі «Ле Комюніст». І па-другое, выступаючы ў рэдакцыйным артыкуле, які падагульвае вынікі «дыскусіі» па ўсёй лініі супроць дыпляматычнай акрабатыкі Троцкага і робіць простыя, шчырыя, цынічныя вывады з яго ўласных пасылак.

— Троцкі — піша рэдакцыя «Ды Фанэ дэс Камунізмус»,—супроць „дыскусіі“, яна заяўляе, што яго думкі „бясспрэчны“ для апазіцыі. Аднак, факты гавораць другое. Але—рэзюміруе рэдакцыя органу Урбанса,—„без неабходнага растлумачэньня розных думак дзеяньне немагчыма“. І паколькі лічачым «рознай ацэнкі разьвіцьця расейскай рэвалюцыі, характару Савецкай Расеі» тлумачыцца той факт, што «апазіцыйныя групы, як француская „Контр ле Куран“, **якая да гэтага часу лічылася цалкам аднадушнай з расейскай апазіцыяй**, раптам (!) выступае з зусім (?) процілеглай думкай».

Пераходзячы да абгаварэньня пытаньня па сутнасьці, аўтар рэдакцыйнага артыкулу заяўляе: «Не Савецкая Расея 1917 г., не Савецкая Расея ленінскай пралетарскай рэвалюцыі, а Савецкая Расея пад панаваньнем цэнтрысцкага сталінскага напрамку 29 г... Ці трэба Савецкую Расею пад гэтым кіраўніцтвам разглядаць, як буржуазную Расею? Не. Гэты паварот яшчэ ў Расеі не адбыўся, хоць мы набліжаемся да яго шпаркімі крокамі. **Ці маем мы, такім чынам, у Расеі яшчэ** пралетарскую дыктатуру? Не. У Расеі дзяржаўная ўлада ўжо не знаходзіцца ў руках пралетарыяту, а—гаворачы словамі Троцкага—у руках канцэлярыі, бюракратычнага апарату. Гэту ступень разьвіцьця Троцкі ахарактарызаваў у сваім лісьце ад 21-X—28 г., як «адваротную керанщыну».

«Абарона Кастрычнікавай рэвалюцыі —далей гаворыцца ў артыкуле—магчыма толькі ў барацьбе са Сталіным. Яна выключае бязумоўнае падтрыманьне сталінскай палітыкі, таксама і замежнай палітыкі. І гэты вывад павінен таксама ўсьвядоміць тав. Троцкі—павучае Урбанс свайго шаноўнага настаўніка—калі ён **дадумае да канца** свой уласны лёзунг: За сацыялістычную бацькаўшчыну? Так! За сталінскі курс? Не!“

Вайна ў выніку правакацыі Чан-Кай-шы здаецца аўтару артыкулу не немагчымай, але ўсё-ж неправдападобнай. Таму што Сталін ведае, што вайна „зварушыла-б пазіцыі цэнтрысцкай бюракратыі, або зьмяла-б яе“. **Калі-б усё-ж вайна выбухнула, задачай „ленінскай апазіцыі“ было-б як у Кітаі, так і ў Расеі ператварыць яе „па Леніну“—у вайну грамадзянскую.** „Яе задачай будзе лютая барацьба са сталінскім бюракратычным апаратам і яго палітыкай. Яе задачай будзе арганізаваць рабочую клясу супроць далейшых уступак кулакам і нэпманам, для ануляваньня зробленых да гэтага часу уступак, для адваёвы пралетарыятам страчаных пазіцый, для адабраньня ўлады ад бюракратычнага апарату і перадачы яе пралетарскай клясе, для аднаўленьня дыктатуры пралетарыяту на ленінскай падставе“.

Гэтая „праграма“ грамадзянскай вайны на выпадак ваеннай сутычкі паміж СССР і Чан-Кай-шысцкай ваеншчынай. Бальшавікі-ленінцы — заканчвае свой артыкул рэдакцыя „Ды Фанэ дэс Камунізмус“—могуць падтрымліваць «сталінскі» СССР толькі так, «як вяроўка падтрымлівае павешанага».

Яшчэ больш—калі магчыма — выразную анты-савецкую пазіцыю занялі ў сваіх—зусім не дыскусійных, а рэдакцыйных— артыкулах афіцыйныя органы двух галоўных трацкісцкіх груп у Францыі і групы бэльгійскай.

У перадавым артыкуле «Контр ле Куран“—той самай, якая нэрвавала Троцкага сваёй „нетактычнасьцю“—„камуністычная апазіцыя перасьцерагае пралетарыят ад усякага сэнтымэнтальнага тлумачэньня падзей, якія датычаць СССР“. У пытаньні аб Усходня-Кітайскай чыгунцы СССР падтрымлівае і бароніць **буржуазныя правы**: ён спасылаецца на **няроўны дагавор** з Кітаем, які забясьпечвае за ім прывілею на частку кітайскай тэрыторыі» (Падкрэсьлена ў арыгінале—Г. В.).

„Перад тварам такога канфлікту, як той, які пагражае сутычкаю паміж СССР і Кітаем, апазіцыя павінна мець адвагу сказаць рабочай клясе, **што яна не павінна стаць на бок сталінскай бюракратыі і яе авантурысцкай вайны**“. (Падкрэсьлена ў арыгінале). І ў процівагу кампартыі Францыі, якая зьвязала сваю антываенную першажнівеньскую агітацыю з лёзунгам рэвалюцыйнай абароны СССР супроць пагражаючай яму вайны, перадавы артыкул трацкісцкага органу піша: «**Зьвязваючы падрыхтоўваемую да 1 жніўня дэманстрацыю супроць вайны з усходня-кітайскім канфліктам, Камінтэрн пазбаўляе гэту дэманстрацыю ўсякага пралетарскага характару**, які яна магла-б яшчэ (!) набыць у вачох некаторых (!) рабочых. Камінтэрн бярэ на сябе ініцыятыву патрабаваць ад мас дэманстраваць за вайну“. І артыкул—**„левай“**—апазіцыянэраў заканчваецца «перасьцерагаю рабочых арганізацый перад камінтэрнаўскімі путчыстамі, якія самі выклікаюць надзвычайныя рэпрэсіі капіталістаў“ *).

У той-жа пункт, што орган групы Паза, б'е „Рэвалюсьён Пралетарэн“ орган групы трацкістаў-сындыкалістаў Монатта-Росмэра. У артыкуле Лузона, перадрукаваным у органе бэльгійскай апазіцыі (і адтуль у бэрлінскай „Фанэ дэс Камунізмус“), высоўваецца лёзунг „Зьвярнуць кітайцам Усходня-Кітайскую чыгунку“.

Мэханізм «умоўнага абаронцтва» Троцкага і яго фактычных вынікаў выкрыў ранейшы яго аднадумец К. Радэк, калі пад уражаньнем першых «замежных» выступленьняў Троцкага ён зразумеў патрэбу з ім парваць.

„Троцкі спасылаецца на тое,—пісаў тав. Радэк у маі г. г. адносна спроб Троцкага „апраўдаць“ сваё супрацоўніцтва ў буржуазным антысавецкім друку, што ён абвергнуў сьцьвярджэньне аб падрыхтоўцы апазіцыяй узброенага паўстаньня. Але адначасна з абвяржэньнем абвінавачаньня, якому ў Эўропе наўрад ці хто верыць, Троцкі абвясьціў імпэрыялістычнаму сьвету, што савецкі ўрад зьяўляецца бандай нягоднікаў, якія захапілі ўладу шляхам змовы, пры дапамозе падлогаў і ашуканства. Партыя-ж складаецца са шкурнікаў, якія ганяюцца за адказнымі пасадамі і грашыма, або з стада баранаў, якія маўчаць, каб ня страціць кавалак хлеба.

«Троцкі спасылаецца на тое, што ён у сваіх артыкулах заявіў усяму сьвету, што ён будзе бараніць СССР супроць інтэрвэнцый. Але кожны палітычна сьвядомы чалавек у Эўропе і Амэрыцы спытаецца: дапушчальна, ці будзеце, па глупству ці як джэнтльмэны, бараніць такі Савецкі Саюз. Але для чаго масам яго абараняць, калі ў гэтай краіне пануюць не Саветы і не

*) У гэтым-жа нумары „Контр ле Куран“ Францускую кампартыю папракае ў тым, што яна замест таго, каб ужываць „ідыёцкую тактыку“: кляса супроць клясы“, не зьвярнулася да сацыялістычнай партыі з прапановаю адзінага фронту, скарыстоўваючы „пратэст“ сацыялістычнага ЦК супроць рэпрэсій. І, пераходзячы ад слоў да „справы“, „Контр ле Куран“ друкуе за подпісам „Камуністычнай апазіцыі“—„Адкрыты ліст Сацыялістычнай Партыі“, за прапановаю правесьці энэргічную кампанію за дапушчэньне францускім урадам—які знаходзіцца пад націскам агентаў Сталіна—Троцкага ў Францыю.

Індустрыялізацыя—поўным ходам

Да вынікаў Усесаюзнага зьезду дзяржаўных плянавых камісій, скліканага для разгляду кантрольных лічбаў на 1929-30 год.

Рашуча выкрываць правых ухілістаў.

Вынікі першага году пяцігодкі Саюзу ССР не адрозьніваюцца ад тых вынікаў, якія мы маем па БССР.

Увесь тэмп сацыялістычнага будаўніцтва ішоў па лініі далейшай індустрыялізацыі краіны, далейшага росту сацыялістычнага сэктару ў народнай гаспадарцы, далейшага палепшаньня матар'яльнага ўзроўню працоўных, уздзеяньня рабочай клясы і бедната вёскі ажыцьцяўленьня задачы культурнай рэвалюцыі і далейшай сацыялістычнай рэканструкцыі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Вынікі па матар'ялах 1928-29 году, г. зн. першага году нашай пяцігодкі ССР, таксама паказваюць, што сацыялістычны наступ на прыватна-капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі выклікаў і выклікае ўсюды шалёнае супраціўленьне кулацкіх спэкулятыўных элемэнтаў і гэтым яшчэ больш абвастрэньне клясавай барацьбы.

Шырока разгорнутая рабочая крытыка і самакрытыка, глыбока прынятая вясковая бедната і серадняцкія пласты сельскай гаспадаркі выявілі ўсё больш і больш недахопаў і хібаў у рабоце нашых установаў і … магчымасьць актыўна ліквідаваць …

Права-апартуністычныя элементы і мірэнцтва капітулюючыя перад кулацкімі гандлярамі і наогул перад цяжкасьцямі нашага росту, зрабілі ня мала шкоду і ўскладнілі і так ужо цяжкую нашу працу. Трэба проста сказаць, што калі-б гэтых выцікаў і памылковых за справаздачны пэрыяд было меней, дык вынікаў можна было-б чакаць значна большых, чымся ёсьць.

… чаму на будучы другі год пяцігодкі ня можа быць нерашучага … выкрыцьця … тэорый" правых ухілістаў, і … ваньня арганізацыйных мер дзе … бо гэтым яшчэ больш забясьпечым правільнае правядзеньне лініі нашай партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

… больш высокі тэмп.

Кантрольныя лічбы другога году пяцігодкі выходзяць з вынікаў дасягнутых у першым годзе пяцігодкі і магчымасьць узяць больш высокі тэмп росту народна-гаспадарчага будаўніцтва, якое ідзе па лініі сацыялістычнай індустрыялізацыі і аграрызацыі сельска-гаспадарчай вытворчасьці. У прыватнасьці рост валавой прадукцыі прамысловасьці вызначаецца 32 проц., зьніжэньне сабекошту … проц., рост прадукцыйнасьці працы 23-25 проц., зьніжэньне будаўнічага індэксу па прамысловасьці 15 проц., па жыльлёваму будаўніцтву 13 проц.

… сельскай гаспадарцы па аграрызаванаму сэктару намечан рост пасяўной плошчы саўгасаў у разьмеры … гэкт., а ў калгасах да 12 млн. … замест намечаных раней у саўгасах 1 з пал. млн гэкт. і ў калгасах 6 млн. гэкт. з адначаснай арганізацыяй … трактарных станцый.

… на трактары надзвычайна … ёсьць літаральны голад пры … зьменьні гэтага попыту ня гледзячы на тое, што плян, намечаны … Саюзу, павялічыў выраб трактароў і вылічае пабудову яшчэ … трактарнага заводу.

… прыватнасьці па БССР мы дамагліся завозу ня менш 1000 трактароў … чакаць можна пакуль каля 350 трактароў—праўда, гэта вялікі рост у параўнаньні з мінулагоднім завозам, калі было завезена толькі некалькі больш як 100 трактароў, значыцца мы сталі перад надзвычайным недахватам, дзякуючы вялікаму значэньню для калектывізацыі нашай сельскай гаспадаркі і ўзмацненьня работы нашых саўгасаў.

Узмацніць падрыхтоўку кадраў.

Кантрольныя лічбы моцна паляпшаюць агульны адстаючы фронт па падрыхтоўцы кадраў. Замест памеркаваных па дзяржбюджэту ў мінулым годзе 475 млн. руб. мяркуецца асыгнаваньне сродкаў па асьвеце ў гэтым годзе ня менш 600 млн. руб. пры агульным росьце дзяржаўнага бюджэту да сумы звыш 10400 млн. руб. і росьце народнага прыбытку на 4 міліарды рублёў, г. зн. з 29,8 міліардаў да 33,8 міліардаў руб.

Кантрольныя лічбы рэальныя.

На гэтым агульным фоне росту і ўзмацненьня сацыялістычнага будаўніцтва нашы кантрольныя лічбы БССР, прапрацаваныя Дзяржпланам, зацьверджаныя СНК і атрымаўшыя дырэктывы ад апошняга Пленум ЦК КП(б)Б маюць поўны адбітак у агульным саюзным пляне: нашы ліміты аказаліся зусім аднакедныны, як рэальныя, ня гледзячы на тое, што па некаторых сярэдніх лімітах СССР яны стаяць значна вышэй: у прыватнасьці па дзяржаўнай прамысловасьці ў нас валавая прадукцыя ўзрастае на 65 проц., у той час як у Саюзе ён намечан да 32 проц.

На гледзячы на гэта, перад намі яшчэ будзе стаяць шэраг цяжкасьцяй пры ажыцьцяўленьні фінансавага пляну нашых кантрольных лічбаў; мы маем шэраг разыходжаньняў з Дзяржпланам Саюзу па фінансаваньню сельскай гаспадаркі—на 12-13 млн. руб., у прыватнасьці па … ніцтву гэта разыходжаньне вызначаецца каля 7-8 млн. руб. Тое-ж самае і па некаторых аб'ектах нашага прамысловага будаўніцтва, як-та па абутковай фабрыцы, заводу сярэдняга-машыннага будаўніцтва, баваўняна-ткацкай і друкарні, а наогул разыходжаньне вызначаецца ў 6-7 млн. руб.

Праўда, усе гэтыя аб'екты не зьяўляюцца спрэчнымі ў пяцігадовым пляне, але ў другім годзе пяцігодкі яны пакуль ня маюць свайго поўнага адбітку.

Наогул трэба сказаць, што курс узят зусім правільна—на скарачэньне будаўнічых тэрмінаў, г. зн. не дапускаць распыленьня сродкаў.

Скараціць тэрміны будаўніцтва.

Па электраэнэргіі і будаўніцтву электрастанцыі наш праэкт на пабудову другой раённай электрастанцыі ў Гомельскім раёне прыняты; справа зараз за самым шпаркім тэмпам і паскоранай работай па скончэньню праэкту (які прапрацоўваецца спэцыяльнай камісіяй ВСНГБ).

Зьезд Дзяржаўных Плянавых Камісій пры разглядзе кантрольных лічбаў з усёй вострасьцю таксама павінен быў падкрэсьліць, што ў мінулым годзе наглядалася арганізацыйная слабасьць у шэрагу арганізацый і ўстаноў па прамысловай і будаўнічай справе, дзякуючы чаму і шэраг паказальнікаў па зьніжэньню кошту будаўнічага індэксу ня быў выканан і пагэтаму на другі год пяцігодкі, плян арганізацыйнай дзейнасьці павінен быў быць вельмі поўна распрацаваны, мабілізуючы людзей і сродкі вакол гэтага павялічанага росту нашага сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама па пытаньнях ажыцьцяўленьня тых лімітаў, якія зараз зьяўляюцца рашаючымі, прычым усё гэта ва ўсіх адносінах датычыцца і нас у БССР.

Палепшыць спажывецкае абслугоўваньне.

Калі мы зараз маем некаторыя цяжкасьці ў забясьпечаньні прадуктамі гарадоў і рабочага насельніцтва, а гэта пакуль нямінуча і на будучы год, дык усё гэта патрабуе надзвычайнай чоткасьці ў рабоце і прыняцьця ўсіх мер, адпавядаючых нашай партыйнай лініі па ўздыму вытворчых сіл сельскай гаспадаркі, накіраваных на шлях аграмаджаньня, якое адзіна зьнішчыць прычыны цяжкасьцяй.

У мінулым годзе рэальная зарплата ўзрасла, але не адпавядала плянам, намечаным першым годам пяцігодкі. Зараз—на будучы год для забясьпечаньня рэальнай зарплаты, даецца вялікі рост намінальнай зарплаты з такім разьлікам, каб ён ня толькі адпавядаў агульнаму росту рэальнай зарплаты, але і крыху направіў адставаньне па пляну, недасягнутаму ў мінулым годзе.

Узьняць якасьць.

Але пры гэтым трэба з усёй выразнасьцю сказаць, што гэта магчыма будзе дасягнуць, калі намечаныя па пляну ліміты будуць выкананы ў 100 проц. разьмеры; асабліва прыходзіцца яшчэ раз падкрэсьліваць неспа… ў галіне зьніжэньня сабекошту, зьніжэньня будаўнічага індэксу, зьнішчэньне браку, палепшаньня якасьці прамысловай прадукцыі; выкананьня пляну хлебазагатовак, прадуктовых і сыравінных загатовак і ахопленьня нашым гандлем рыначнага рэгуляваньня ў тых разьмерах, якія намячаюцца кантрольнымі лічбамі.

Разгарнуць творчасьць працоўных.

Усё гэта, зразумела, патрабуе бальшога напружаньня ў рабоце, вытрыманасьці і дысцыплінаванасьці.

На заклік нашай партыі творчы ўздым працоўных мас узьнят высока. Сацыялістычнае спаборніцтва, пераход на бесьперапынны тыдзень, глыбокая крытыка і самакрытыка і выяўленьне недахопаў, чыстка савецкага апарату ад бюракратычных элемэнтаў і неразумеючых задач сацыялістычнага будаўніцтва і ўліцьце ў іх новых кадраў з рабочых даюць нам поўную ўпэўненасьць, што наш плян другога году пяцігодкі будзе выканан з перавышэньнем, а гэтым мы яшчэ больш набліжаемся да таго тэрміну, калі мы зможам сказаць, што мы ня толькі даганяем капіталістычныя краіны ў адносіне вытворчага разьвіцьця, але ўжо і абганяем.

М. КАРКЛІН.

Пастухі падпісаліся на 300 рублёў на трэцюю пазыку.

Пастухі гор. Калінкавічы, што на Мазыршчыне, актыўна адгукнуліся да падпіскі на 3 пазыку індустрыялізацыі краіны. За адзін вечар пастухі падпісаліся на 300 р.

Падпіска сярод пастухоў працягваецца.

Н. Ланда.

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА „ДНЮ ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ“.

Сродкі на ўтварэньне трактарнай калёны павінны быць сабраны.—Неабходна арганізаваць пралетарскае т-ва садзейнічаньня калектывізацыі.—Прафсаюзы ў справе збору сродкаў на трактарную калёну і ўтварэньня т-ва садзейнічаньня калектывізацыі нічога ня робяць.

Мабілізуем масы вакол задач сьвята ўраджаю і калектывізацыі.

Будаўніцтва машына-трактарных станцый і калектывізацыя.

XVI партыйная канфэрэнцыя, адзначыўшы вялікае значэньне машына-трактарных станцый, як рычага поўнай калектывізацыі сялянскай гаспадаркі, прызнала неабходным „разьвіццё шырокай сеткі“ такіх станцый. Да апошняга часу лік іх вымяраўся нязначнымі адзінкамі. З вясны будучага году будзе арганізавана 102 станцыі. Кожная МТС будзе ахапляць поўнасьцю аграмаджаны масыў сялянскіх земляў у разьмеры ад 50 да 60 тысяч гэктараў. На кожным такім масыве станцыя ня толькі ламае існуючыя межы і кладзе канец адсталым формам сялянскай гаспадаркі, ня толькі захапляе нескарыстаныя плошчы, неўрогі, залежы і г. д., нарэшце ня толькі зьнішчае трохпольле, уводзячы манапольны севазварот з чыстасортным засевам, але разам з тым стварае падставу **поўнай калектывізацыі.**

Гэта падстава зьяўляецца ў першую чаргу ў тым, што аграмаджваецца зямля—шляхам зьнішчэньня індывідуальных надзелаў і аб'яднаньня іх у адзіны паляводчы масыў буйнейшых разьмераў.

Падругое, аграмаджваецца праца,—шляхам выкананьня сялянскімі аб'яднаньнямі па дагавору ўсіх работ, неабходных у буйнай мэханізаванай гаспадарцы. Патрэцяе—аграмаджваюцца сродкі вытворчасьці,—пачынаючы з таго, што індывідуальны інвэнтар замяняецца трактарамі і складанымі машынамі машына-трактарных станцый. … ва непадзельнага … ецца адразу-ж асно… … мерканьня сродк… … паяў акцый трактарацэнтру.

Само самой зразумела, машына-трактарныя станцыі сустрэнуць шалёнае супраціўленьне з боку капіталістычнай вярхушкі вёскі.

Наколькі машына-трактарныя станцыі выкарчоўваюць у сельскай гаспадарцы карэньні капіталізму, клясавы вораг будзе ўсімі сіламі і спосабамі перашкаджаць будаўніцтву МТС, затрымліваць іх работу, праводзіць ня толькі контр-рэвалюцыйную агітацыю, але і ёсьць факты контр-рэвалюцыйнага шкодніцтва. Пагэтаму асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на растлумачальную працу і на **арганізацыі мас вакол машына-трактарных станцый.**

Цэнтральны камітэт партыі ў спэцыяльнай дырэктыве надкрэсьлівае, што раёны будаўніцтва МТС павінны быць выдзелены, як **паказальныя раёны масавай працы.** Партыйныя камітэты тых акруг, дзе будуць будавацца машына-трактарныя станцыі „павінны прыстасаваць пляны сваёй работы, а таксама пляны работы Акрвыканкомаў да задач, зьвязаных з разгортваньнем МТС і поўнай калектывізацыяй сялянскіх гаспадарак, паставіўшы гэтыя задачы **ў цэнтры ўвагі** работы адпаведных арганізацый“.

XVI партыйная канфэрэнцыя, надкрэсьліваючы важнасьць будаўніцтва машына-трактарных станцый, адзначыла, што «**значэньне іх будзе павялічвацца з году ў год**». Як гэта адбіваецца ў пяцігадовым пляне Трактарацэнтру? У канцы пяцігодкі лік машына-трактарных станцый будзе даведзен да 500. Плошча, якую яны ахопяць, будзе складаць 20 мільёнаў гэктараў. З першага (1929-30 г.) кожная станцыя разгорне сваю работу на плошчы 15-20 тысяч гэктараў, а затым праз бліжэйшыя год-два гэта плошча будзе даведзена кожнай станцыяй да намечаных аптымальных разьмераў 50-60 тысяч гэктараў. Разьмер таварных лішкаў за гэтыя пяць год … г. яны складуць наступным чынам: … тон, у 1932 г.—3510 тыс. … 1933 г.—6150 тысяч тон і, … у 1934—9 з палов. мільёнаў тон, г. зн. звыш паўмільярда пудоў хлеба. У падставу гэтых разьлікаў узяць вопыт ужо працуючых машына-трактарных станцый, у якіх разьмер таварных лішкаў (напрыклад, у Шаўчэнкаўскай станцыі) даходзіць да 70 пр. валавага ўраджаю.

ТРЭБА АРГАНІЗАВАЦЬ Т-ЗА САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

(Гутарка са старшынёй ЦП саюзу с.-гасп. і лясн. рабочых тав. Вайтэнкам).

ЦП саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых дало на месцы дырэктывы, каб пры ўсіх рабкомах рабочыя калектывы ў дзень ураджаю і калектывізацыі залажылі гэктар індустрыялізацыі. Калі гэта дырэктыва будзе ажыцьцёўлена поўнасьцю, дык яно павінна даць 1000 гэктараў. Сродкі ад гэктараў індустрыялізацыі пойдуць у фонд арганізацыі чырвонай трактарнай калёны.

Арганізацыя сіламі пралетарыяту трактарнай калёны на практыцы пакажа змычку гораду з вёскай не на словах, а на справе. Арганізацыя трактарнай калёны будзе мець значэньне ня толькі матэрыяльнага парадку, але адыграе вялікую ролю ў больш цеснай сувязі бядняцкага серадняцкага сялянства з пралетарыямі гораду.

Пытаньне аб утварэньні таварыства садзейнічаньня калектывізацыі ў ЦП саюзу яшчэ не абгаварвалася, але я лічу, што такое таварыства павінна быць арганізавана. Пытаньне заключаецца ў тым,—у якой форме, ці ў форме рэарганізацыі шэфтаварыстваў, ці шляхам арганізацыі новага таварыства. На маёй думцы трэба рэарганізаваць шэфтаварыствы ў тым напрамку, каб апошнія ўвесь цэнтр сваёй працы перанесьлі на садзейнічаньне калектывізацыі с. гаспадаркі.

Будучай арганізацыі садзейнічаньня калектывізацыі ў вёсцы неабходна будзе ўзяцца і за арганізацыю трактарных калён.

АСЬВЕТНІКІ—НА ДАПАМОГУ УТВАРЭНЬНЮ ТРАКТАРНАЙ КАЛЁНЫ.

(Гутарка з нам. старшыні ЦП саюзу працасьветы тав. Мельнікам).

Ідэю ўтварэньня трактарнай калёны трэба толькі вітаць. Асьветнікі Савецкай Беларусі павінны прыняць і прымуць актыўны ўдзел як у правядзеньні растлумачальнай працы, так і па збору сродкаў на арганізацыю трактарнай калёны. Пытаньне гэта будзе абгаворана на бліжэйшым пленуме ЦП нашага саюзу.

Нашы шэфтаварыствы трэба рэарганізаваць у напрамку больш мэтавай устаноўкі пры правядзеньні працы ў вёсцы. Трэба адмовіцца ад культуртрэгерства, а ўзяць канкрэтна вызначаную ўстаноўку: калектывізацыя, арганізацыя таго або іншага вытворчага сельска-гаспадарчага аб'яднаньня сярод сялянства.

Пытаньне гэта трэба абгаварыць сярод шырокага прафактыву, пры ўдзеле асьветніцкіх мас гораду.

У хвасьце мас...

З газэт мы ведаем, што рабочыя асобных прадпрыемстваў амаль усіх гарадоў Савецкай Беларусі па сваёй уласнай ініцыятыве пачалі зьбіраць сродкі на арганізацыю трактарнай калёны імя БССР.

Рабочыя гэтым мерапрыемствам адказваюць працоўнаму сялянству на яго чырвоныя абозы з хлебам, трактарная калёна павінна паказаць на справе клопаты рабочай клясы аб узмацненьні змычкі гораду з вёскай.

Рабочыя праяўляюць ініцыятыву, выносяць пастановы адпрацаваць дзень на арганізацыю трактарнай калёны, якая павінна дапамагчы больш шпаркаму тэмпу калектывізацыі нашай сельскай гаспадаркі, а прафсаюзныя органы...

Аб іх мы і зьбіраемся гаварыць.

У ЦП саюзу харчавікоў адказны працаўнік—нам. загадчыка культаддзелу т. Юркові ч кажа, што на некаторых прадпрыемствах па ініцыятыве рабочай моладзі ўжо зьбіраюцца сродкі ў фонд арганізацыі трактарнай калёны.

Бачыце, рабочыя масы ўжо даюць назву гэтай вельмі важнай кампаніі, рабочыя гавораць, што яны зьбіраюць сродкі ў фонд арганізацыі трактарнай калёны.

Цэнтральны-ж орган саюзу харчавікоў яшчэ ня выбраў часу падумаць над тым, каб скарыстаць ініцыятыву рабочых мас і разгарнуць шырока кампанію за ўдзел рабочых у калектывізацыі вёскі, у зборы сродкаў на трактарную калёну.

ЦП саюзу харчавікоў гэтым пытаньнем яшчэ не займалася, яно не спрабуе скарыстаць ініцыятыву мас. ЦП харчавікоў ня ўдзяліла яшчэ дырэктыў аб новым тэмпе прафсаюзнай працы, а працуе па старому, чакаючы, відаць, дырэктыў зьверху.

Вам цікава як стаіць справа ў ЦП саюзу скурнікаў?

Ды таксама, як і ў харчавікоў. Пытаньне аб мабілізацыі ўвагі рабочых мас на арганізацыі трактарнай калёны, аб утварэньні таварыства садзейнічаньня калектывізацыі вёскі яшчэ не абгаварвалася. Першае будзе абгаварвацца на нарадзе прафактыву, а другое нават у ЦП саюзу і не падымалася.

Крок у крок з саюзам скурнікаў ідзе Белбюро ЦК саюзу чыгунікаў, дзе таксама нічога ў гэтым напрамку ня робіцца.

ЦП саюзу савгандльслужачых ня хоча адставаць ад паказаных саюзаў і пытаньнямі ўтварэньня фонду трактарнай калёны, арганізацыяй таварыства садзейнічаньня калектывізацыі вёскі, яшчэ не займалася.

У ЦП саюзу мэталістаў загадчык АТЭ т. Арэшка нават адказаў нашаму супрацоўніку, што яны думаюць устрымацца з пытаньнем аб фондзе трактарнай калёны.

Не лепш стаіць справа і на іншых саюзах, а ў гэты час рабочыя масы праз галовы праворганаў робяць вялікую справу, разгортваюць вельмі важную палітычную кампанію.

Вывады?

Мы думаем, што яны будуць залішнімі, бо і загадчык аргаддзелу ЦСПСБ т. Калодка нашаму супрацоўніку адказаў, што ён яшчэ ня думаў аб утварэньні т-ва садзейнічаньня калектывізацыі вёскі, але падумае...

В. Паўночны.

Краязнаўства і „Дзень ураджаю і калектывізацыі“

Кожны год 14 кастрычніка ў раёнах праводзіцца дзень ураджаю. Сёлета гэты дзень будзе сьвяткавацца пад лёзунгам калектывізацыі сельскай гаспадаркі і мабілізацыі бядняцка-серадняцкіх сялянскіх мас для працы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і высьвятленьню капіталістычных элемэнтаў вёскі.

Нашы краязнаўчыя арганізацыі, як масавыя савецка-грамадзкія арганізацыі, павінны прыняць самы актыўны і непасрэдны ўдзел у правядзеньні шырокай масавай кампаніі ў дзень ураджаю і калектывізацыі. Яшчэ ў працэсе падрыхтоўкі да належнага правядзеньня гэтага дню краязнаўчыя арганізацыі павінны выявіць канкрэтныя дасягненьні раёну ў падвышэньні ўраджайнасьці, у павялічэньні плошчы засеву, у машынізацыі і кантрактацыі сельскай гаспадаркі раёну і ў мэтах папулярызацыі ідэі калектывізацыі арганізаваць вывучэньне сучаснага стану і пэрспэктыў у разьвіцьці калгаснага руху ў раёне як на працягу бліжэйшага часу, так і на працягу пяцігодкі.

Краязнаўчыя арганізацыі ў часе падрыхтоўкі да дню ўраджаю і калектывізацыі і ў самы гэты дзень павінны быць ініцыятарамі экскурсій у калгасы, саўгасы, на паказальныя вучасткі, станцыі і г. д. Адначасна з гэтым трэба высьвятліць вынікі і пэрспэктывы сацыялістычнага спаборніцтва па вёсках, сельсаветах, па калгасах і саўгасах раёну.

Уся праведзеная падрыхтоўчая праца па сацыялістычнай перабудове нашай сельскай гаспадаркі павінна быць належным чынам ілюстравана на выстаўках, што будуць наладжаны ў гэты дзень. Краязнаўчыя арганізацыі павінны праявіць ініцыятыву ў належным афармленьні выставак картаграмамі, дыяграмамі, фатаграфіямі, калекцыямі, апісаньнямі, ру… арганізацыі асобна… краязнаўчага аддзелу на выстаўцы, які паказаў-бы шкоду старых рэлігійных сьвят (Пакровы) і добра папулярызаваў-бы новыя пралетарскія формы культуры, быту і неабходныя аграномічныя веды для перабудовы на калектыўных началах сельскай гаспадаркі.

Самыя выстаўкі павінны вывучацца нашымі краязнаўчымі арганізацыямі з боку скарыстаньня іх экспанатаў на будучай усебеларускай сельска-гаспадарчай і прамысловай выстаўцы ў Менску. Раённыя выстаўкі таксама павінны даць матар'ял для мясцовых краязнаўчых музэяў, павінны папоўніць іх. І там, дзе няма такіх музэяў, краязнаўчыя арганізацыі павінны скарыстаць памянёныя выстаўкі, як аснову краёвых музэяў.

У мэтах плянавага правядзеньня дню ўраджаю і калектывізацыі, краязнаўчыя арганізацыі павінны атрымаць шчыльную сувязь з раённымі камісіямі сьвяткаваньня. Уся падрыхтоўчая праца па правядзеньню гэтага дню паказана ў праграме, што надрукавана ў газэце „Савецкая Беларусь“ ад 27 верасьня за № 221. Краязнаўчыя арганізацыі павінны азнаёміцца з гэтай праграмай і скарыстаць яе ў сваёй працы. Наогул, уся праца нашых краязнаўчых арганізацый павінна быць так пабудавана, каб выразна садзейнічала сацыялістычнаму будаўніцтву ў раёне і намячала канкрэтныя мерапрыемствы ў гэтым напрамку.

ЦБК просіць усе краязнаўчыя арганізацыі паведаміць яго не пазьней 30 кастрычніка 1929 г. аб усёй працы, якую яны зрабілі ў часе падрыхтоўкі да дню калектывізацыі ў самы гэты дзень.

ЦБК.

… старыят, а групка гвалтаўнікоў і … урыстаў, якія ўзялі за горла на… камуністычную партыю? Калі яны адносяцца да сваёй партыі, дык … яны адносяцца да краіны? Чаму … ныя масы гэтай краіны павінны … ваць такую ўладу? І што павінны думаць пры чытаньні артыкулаў … га **замежныя рабочыя?** Яны … ны сабе сказаць: «мы ня маем … тавы абараняць такую краіну».

… міжнародным «лягеры» трацкістаў … **кі са сваёй гнілой дыплёматыяй**, якая прыкрывае яго сапраўд… „клемансысцкія“ пляны—скары… цяжкасьці СССР і магчымыя ва… ускладненьні для звяржэньня … цкага ўраду і захапленьня ім улады… **застаўся зусім ізаляваным.** … верныя прыяцелі Урбансы, Пазы, … ры і Ван Оверстратэны—зрабілі … ныя вывады з яго ўласнай прад… зікі, адкрылі яго карты і „заў… … **сталі на бок ворагаў СССР.**

Пазіцыя правых рэнэгатаў па пытаньні аб захопе Усходня-Кітайскай чыгункі і небясьпекі імпэрыялістычнай вайны супроць СССР непараўнальна больш асьцярожная, чымся пазіцыя іх прыяцеляў «зьлева». У агульных артыкулах свайго цэнтральнага … скага органу „Геген дэн Штром“, … выказваюцца за абарону СССР, … супроць сацыял-дэмакратычнай … ацкай мазы аб «чырвоным імпэрыялізме» і клянуцца ў сваёй адданасьці справе Савецкага Саюзу.

Брандлерыянцы стаяць у сваёй практычнай агітацыі на глебе самага плоскага пацыфізму і вядуць штодзённа … агідную кампанію супроць рэвалюцыйнай антываеннай барацьбы Камінтэрну і КПН. Вайны—паўтараюць яны—ня будзе: „Савецкі ўрад … разоў даведў, што, ня гледзячы на ўсе правакацыі, ён робіць усё, каб захаваць мір. **Пагэтаму**, зьяўляецца … калі партыйны друк КПН паказвае зараз справу так, быццам Савецкі Саюз стаў зараз непасрэдна перад вайной». („Міжнароднае становішча і небясьпека вайны», „Геген дэн Штром“, 20-VIII).

Вайны ня будзе, ня трэба пераўвялічваць небясьпеку вайны, адзіным лёзунгам павінен быць „мір“—гэткі галоўны лейтматыў усіх выступленьняў правых. „Неабходна выказаць са ўсёй вострасьцю, што крыкі аб „вострай ваеннай небясьпецы“, якія ўжо не адзін год паўтараюцца, служаць толькі на карысьць сацыял-дэмакратыі і буржуазіі... („Першае жніўня і апазіцыя“, „Геген дэн Штром“, 13-VIII).

Асабліва яскрава гэта „лінія“ выявілася ў іх напружанай дзейнасьці па **сабатажу першажнівеньскага выступленьня.**

„Задачай камуністаў—пісалі яны ў сваім першажнівеньскім маніфэсце—зьяўляецца не палягчаць сацыял-дэмакратыі яе фальшывую ролю прадказальніка міру сьлянымі(!) крыкамі аб вайне, а паказаць сябе сапраўднымі і праўдзівымі ворагамі імпэрыялістычнай вайны і імпэрыялістычных падрыхтовак да вайны. **У гэты час небясьпек для Савецкага Саюзу неабходна найбольшая згуртаванасьць усіх камуністаў, усіх камуністычных сіл для яго абароны, як і для барацьбы з імпэрыялістычнымі падрыхтоўкамі вайны. Пагэтаму спыніце цкаваньне правых, спыніце выключэньне і расколы, выпраўце ўсе тактычныя памылкі, якія аслабляюць камунізм і ўзмацняюць рэфармізм“.** (Асобны ліпнёўскі дадатак да «Геген дэн Штром»).

Яшчэ больш цынічна выглядае гэта спроба палітычнага вымагальніцтва „у гэты час небясьпекі“ у выступленьнях саюзьніцы брандлерыянцаў—групы аб'яднаных чэскіх рэнэгатаў—Гайсаў, Ілекаў, Боленаў і Нэйратаў. «У момант вялікай небясьпекі вайны супроць СССР—тэлеграфавалі яны Выканкому Камінтэрну ў канцы ліпеня—цэнтральны камітэт апазіцыі КПЧ звяртаецца да вас з заклікам ужыць усе неабходныя меры для канцэнтрацыі ўсіх камуністычных сіл **у рамках УсеКП і Камінтэрну.** Адзіны шлях **для абароны Савецкага Саюзу—неадкладная ліквідацыя цяперашняга няправільнага палітычнага курсу**, які выклікаў поўную няздольнасьць дзейнасьці партыі» (тэлеграма надрукавана ў „Геген дэн Штром“ 27-VII побач з „адозваю“ такога-ж зьместу да «клясава-сьвядомага пралетарыяту Чэхаславацкай Рэспублікі»).

У гэтым выступленьні характэрна тое, што ілекаўцы і брандлерыянцы бяруць пад сваю абарону і расейскіх правых, „патрабуюць“ адмаўленьня ад „няправільнага палітычнага курсу“, **прыпыненьня „цкаваньня правых“ у УсеКП(б).**

У пазіцыі рэнэгатаў, як «левых», так і „правых“ у адносіне да ваенных падрыхтовак імпэрыялізму, да пагражаючай СССР небясьпекі вайны—ёсьць асноўны аб'ядноўваючы іх пачатак. Гэта, ў лепшым выпадку, фальшывыя, толькі на словах заявы аб умоўнай гатоўнасьці і ўмоўнай абароне Савецкага Саюзу ёсьць шантажысцкія патрабаваньні ў адносіне да Камінтэрну і да УсеКП(б) пры ўзмоцненай барацьбе супроць актыўнай рэвалюцыйнай антываеннай кампаніі, якая разгортваецца кампартыямі. Вось гэткая пазіцыя брандлерыянцаў і Троцкага. Ці—як у пераважнай большасьці трацкістаў у Нямеччыне, Францыі, Бэльгіі—адкрытае, у адных шэрагах з сацыял-фашыстамі і імпэрыялістамі, бессаромнае цкаваньне СССР, актыўны ўдзел у падрыхтоўцы супроць яго войнаў і інтэрвэнцый.

Г. Валецкі.

Рыхтуюцца да сьвята ўраджаю.

Ворша, 1-Х. Аршаншчына дзейна рыхтуецца да правядзеньня „Дню ўраджаю і калектывізацыі“. У падрыхтоўчую працу ўцягнуты камсамольцы, прафсаюзныя і каапэрацыйныя арганізацыі і шэфскія таварыствы. Усім райвыканкомам, сельсаветам і вясковым арганізацыям дадзены ўказаньні па правядзеньню „Дню ўраджаю і калектывізацыі“.

Утворана акруговая камісія, якая і кіруе арганізацыйна-падрыхтоўчай працай.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

НА КУЛАЦКАЙ ГАСПАДАРЦЫ МАРОЗА ЎТВОРАНЫ БУЙНЫ КАЛГАС.

ПОЛАЦАК, 1-10. Сіламі акруговых і цэнтральных органаў было выяўлена, што так званая „культурна-дасьледчая гаспадарка“ Мароза ў м. Фатынь, Лепельскага раёну, на справе зьяўляецца кулацкай гаспадаркай, якая ня можа служыць прыкладам для вясельнага сялянства. Згодна пастановы адпаведных органаў, кулацкая гаспадарка Мароза была ліквідавана.

Два з паловай месяцы таму назад на месцы, дзе раней панаваў кулак Мароз, быў утвэран калгас імя Леніна, які зараз мае больш 500 гэкт. зямлі, налічвае 30 гаспадарак—169 асоб,—галоўным, чынам з ліку беднякоў, батракоў і незаможных сялян. У калгас увашло 11 партыйцаў і 8 камсамольцаў. Старшынёй абраны камуніст т. Вашун.

Калгас распачаў шырокае будаўніцтва. Мяркуецца давесьці плошчу зямлі ў калгасе да 1000 гэкт., а праз некалькі год утварыць буйную камуну.

Пераходзім на адзіны выхадны дзень.

Полацак, 1-Х. За апошнія часы шэраг устаноў і прадпрыемстваў вынесьлі пастанову, каб зрабіць адзіны выхадны дзень у аўторак, які дасьць магчымасьць назаўсёды адмовіцца ад рэлігійных сьвят і, наогул, спрыяе працы.

Адзіны выхадны дзень мае вялізарнае значэньне як у працы, так і ў інтэрнацыянальным выхаваньні. Першымі на адзіны дзень перайшлі будаўнікі гораду.

Але трэба справу наставіць так, каб усе ўстановы перайшлі на адзіны выхадны дзень у аўторак, бо ёсьць выпадкі, калі адна ўстанова перайшла, а другая не, што адбіваецца на ўсёй працы.

***

ГОМЕЛЬ, 1-Х. На сярніковых фабрыках узмоцнена рыхтуюцца да пераходу на бесьперапынны рабочы тыдзень. На фабрыцы „10 Кастрычнік“ распрацаваны два праэкты. Першы праэкт наступнага зьместу: фабрыка працуе ў 3 зьмены па 7 гадзін—7 дзён у тыдзень. Кожны рабочы пасьля 6-ці дзён работы мае дзень адпачынку і, апроч таго, мае кожны месяц 2 дні за лік двух гадзін перад адпачынкам. Пры гэтай сыстэме фабрыка будзе выпрацоўваць больш на 107 тысяч скрынь, лік рабочых павялічыцца на 16,8 проц., сабекошт зьнізіцца на 8,49 проц.

Па другому праэкту мяркуецца пуск фабрыкі на 2 зьмены па 8 гадзін. Кожны рабочы пасьля 5-ці дзён мае два дні адпачынку. Пры гэтым варыянце адхіляецца 3-я зьмена. Лік рабочых застаецца бяз зьмены. Выпрацоўка па гэтаму праэкту зьменшыцца на 28 тысяч скрынь, сабекошт зьнізіцца на 3,96 проц. Для рамонту варштатаў фабрыка штодзённа будзе мець 6 гадзін.

Вытворчая камісія выказалася за 5-ці дзённую працу. Апроч таго, пастаноўлена перавесьці клеільны цэх на бесьперапынны тыдзень зараз-жа, што дасьць магчымасьць фабрыцы працаваць на 6 аўтаматах.

Ад варштату—да кіраўніцтва дзяржавай.

Бабруйск, 1-Х. На апошнім пленуме Бабруйскі гарадзкі савет абраў сэкратаром гарадзкога савету рабочага заводу „Чырвоны Харчавік“ тав. Акуліча.

Тав. Акуліч працуе па найму з 1919 г. На заводзе „Чырвоны Харчавік“ працуе некалькі год, карыстаецца сярод рабочых вялікім аўтарытэтам. Агульны сход рабочых аднагалосна вылучыў яго на працу у гарсавет.

Тав. Акуліч—член КП(б)Б з 1926 году, доўгі час быў у Чырвонай арміі. У апошні час быў сэкратаром партыйнай ячэйкі заводу; зьяўляецца кандыдатам бюро гаркому і акругкому КП(б)Б.

Камсамольцы дапамагаюць у зборы торфу.

Полацак, 1-Х. Камсамольская брыгада у ліку 18 асоб, з м. Вушачы зрабіла выхад у камсамольскую камуну „КІМ“, дзе была зроблена практычная дапамога ў правядзеньні „двухтыднёвіка торфу“: вывезьлі 120 вазоў торфу на поле, дзе будзе пасеяна жыта.

Праца праходзіла з вялікім посьпехам. Сябры камсамольскай камуны далі падзяку маладым брыгадзірам за іх карысную дапамогу.

Апрача гэтага, мяркуецца аказаць такую-ж дапамогу сялянам-беднякам, якія самі ня маюць магчымасьці правесьці збор торфу.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

аб становішчы працы па падрыхтоўцы першай усебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Заслухаўшы інфармацыю аб становішчы працы па падрыхтоўцы Першай Усебеларускай Выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць, што, ня гледзячы на позьні пачатак работы, праароблена значная праца па падрыхтоўцы тэрыторыі да Выстаўкі, як-та раскарчована і ўзорана ўся плошча, заканчваецца вывазка пераглою пад шматпалёвыя севазвароты, ягаднік і інш. культуры, а таксама пачата будаўніцтва часткі павільёнаў.

2. Адзначыць наступныя недахопы:

а) складаньне канкрэтных плянаў будаўніцтва Выстаўкі, пасылка іх на месцы, разьмеркаваньне экспанатаў і плошчы па акругах зроблена са спазьненьнем. Па прамысловасьці (дзяржаўнай і мясцовай), у выніку несваечасовай распрацоўкі плянаў, ня дадзены адпаведныя дырэктывы мясцом;

б) Белдзяржбуд недастаткова шпаркім тэмпам праводзіць будаўніцтва Выстаўкі;

в) ня гледзячы на пастанову СНК за 5 чэрвеня 1929 г., народныя камісарыяты і цэнтральныя ўстановы, асабліва ВСНГ, ня рыхтуюцца належным чынам да Выстаўкі, а абмяжоўваюцца толькі вылучэньнем спэцыялістаў. Менгарсавет ня ўжыў належных захадаў да пракладкі трамвайнай лініі да Выстаўкі і забрукаваньня шляхоў;

г) наваколо такога важнага для гаспадарчага і культурнага будаўніцтва краіны мерапрыемства, як пабудова Выстаўкі, да гэтага часу не прыцягнута ўвага шырокіх рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. Цэнтральны мясцовы друк да гэтага часу недастаткова зьвяртаў увагу грамадзкасьці на гэтую справу. Грамадзкія ўстановы не разгарнулі адпаведнай тлумачальнай працы. Ня ўжыты крокі для скарыстаньня кіно і радыё ў мэтах папулярызацыі Выстаўкі;

д) акруговымі ўстановамі і арганізацыямі зьвернута вельмі мала ўвагі на справу падрыхтоўкі экспанатаў;

е) Дырэкцыяй Выстаўкі ня ўжыты захады да папулярызацыі Выстаўкі: ня выдана ніводнай брашуры, ніводнага плякату і лёзунгу, а таксама не наладжана справа па выданьню інфармацыйнага бюлетэня.

Для забясьпечаньня пасьпяховасьці будаўніцтва Выстаўкі, яе арганізацыі і адчыненьня ў вызначаны тэрмін:

1. запрапанаваць Дырэкцыі Выстаўкі ўжыць належныя захады да зьнішчэньня недахопаў у правядзеньні работ па арганізацыі будаўніцтва Выстаўкі, пачатак якіх затрымоўваецца з-за няўвязкі і нядбайных адносін з боку асобных арганізацый, для чаго:

а) прапанаваць усім народным камісарыятам ажыцьцяўляць мерапрыемствы, зьвязаныя з арганізацыяй Выстаўкі ў першачарговым парадку;

б) прапанаваць усім акруговым выканаўчым камітэтам тэрміново даць Дырэкцыі Выстаўкі падрабязныя зьвесткі аб усіх ужытых захадах па падрыхтоўцы да Выстаўкі і аб сродках, прадугледжаных па мясцовым бюджэце;

в) усе савецкія, гаспадарчыя і іншыя органы павінны выконваць усе загады Дырэкцыі Выстаўкі, якія датычацца арганізацыі гэтае Выстаўкі на падставе палажэньня аб Выстаўцы;

г) усе народныя камісарыяты і ўстановы павінны ўскладаць на аднаго з членаў калегіі адказнасьць за каляндарнае правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў, зьвязаных з арганізацыяй Выстаўкі, а ў тых народных камісарыятах, дзе калегіі няма, на аднаго з адказных працаўнікоў свайго камісарыяту;

д) абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі, Белсельсаюз, Белкалгассаюз, Белсельтрэст і Навукова-Дасьледчы Інстытут імя У. І. Леніна вылучыць належных спэцыялістаў для выкананьня працы, зьвязанай з падрыхтоўкай да Выстаўкі, і праверкі працы, якая праводзіцца ў акругах, аслабаніўшы іх ад другой працы ў установе.

2. Абавязаць усе акруговыя і раёнавыя выканаўчыя камітэты ўжыць рашучыя захады да сваечасовай падрыхтоўкі і выкананьня заданьняў, зьвязаных з арганізацыяй Выстаўкі.

3. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы ўжыць неадкладныя захады да разгортваньня масавай палітасьветнай работы ў напрамку растлумачэньня сярод шырокіх колаў батрацтва, бядняцка-серадняцкага сялянства мэтаў і задач Выстаўкі праз школы, палітасьветныя ўстановы і інш.

4. Абавязаць Белдзяржкіно ўключыць у свой плян выпуск аднэй невялікай фільмы для папулярызацыі Выстаўкі, а таксама некалькі культурфільм па сельскай гаспадарцы.

5. Абавязаць Белдзяржбуд праводзіць будаўніцтва Выстаўкі ў пазачарговым парадку, забясьпечыўшы будаўніцтва ўсімі належнымі матар'ялямі.

6. Прасіць ЦСПСБ арганізаваць грамадзкую думку наконт пытаньня падрыхтоўкі і арганізацыі Выстаўкі і распрацаваць пытаньне пра арганізацыю шэфства рабочых арганізацый над экскурсантамі-сялянамі.

7. Даручыць Менскаму Гарадзкому Савету сваечасова пракласьці трамвайную лінію і забрукаваць шляхі да Выстаўкі.

8. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі праверыць выкананьне дадзеных дырэктыў, прыцягваючы за нядбайнасьць і безьдзейнасьць да адказнасьці.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. кіраўніка спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР **А. Дубавіцкі.**

30 верасьня 1929 г.
гор. Менск.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

На апошнім чарговым пасяджэньні Савету Народных Камісараў пад старшынствам тав. М. М. Галадзеда былі разгледжаны разам з іншымі, наступныя пытаньні.

Быў заслухан даклад НК РСІ пра рэарганізацыю акруговага, раённага гарадзкога і сельскага савецкага апарату Віцебскае вопытна-паказальнае акругі. Для канчатковага рэдагаваньня праэкту пастановы складзена камісія, якая павінна праз тыдзень падаць у СНК праэкт пастановы.

Быў заслухан таксама даклад НК РСІ і садаклад Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі аб праведзенай рабоце і далейшых задачах у галіне барацьбы з дзіцячай бясспрытульнасьцю. Для распрацоўкі праэкту пастановы складзена камісія.

Камітэтам па хэмізацыі народнай гаспадаркі быў зроблен даклад пра вынікі мерапрыемстваў па хэмізацыі народнай гаспадаркі БССР і пра далейшыя пэрспэктывы. Для распрацоўкі праекту пастановы СНК па гэтым пытаньні таксама складзена камісія.

ПРА РАСПАЎСЮДЖВАНЬНЕ ГАТУНКОВАГА НАСЕНЬНЯ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

Надаючы вялізарнае значэньне пасевам гатунковым насеньнем у справе падвышэньня ўраджайнасьці, СНК пастанавіў забараніць скарыстаньне гатунковага насеньня на спажывецкія і прамысловыя патрэбы, калі сарты гэтага насеньня прызнаны лепшымі для пасеву ва ўмовах БССР. Сьпіс сартоў, якія падлягаюць браніроўцы, устанаўляецца НКЗ разам з НК Гандлю і штогод абвяшчаецца не пазьней 1-га кастрычніка.

Пачынаючы з 1929 г. усе гаспадаркі павінны ўвесь ураджай гатунковага насеньня, за выключэньнем патрэбнай колькасьці насеньня для свайго пасеву, здаць сельска-гаспадарчай каапэрацыі ў абмен на звычайнае насеньне. НК Гандлю запрапанавана вызначыць пераходзячы рэзэрвовы фонд у 1700 тон у распараджэньне с.-г. каапэрацыі для патрэб абмену. Уся практычная праца па арганізацыі абмену і скарыстаньня сартавога насеньня сярод насельніцтва ўскладаецца на сельска-гаспадарчую каапэрацыю.

Уся наяўнасьць гатунковага насеньня ў рэспубліцы павінна скарыстоўвацца ў парадку суцэльных пасеваў. Раёны суцэльных пасеваў сартавым насеньнем вызначаюцца сельска-гаспадарчай каапэрацыяй разам з зямельнымі органамі. Усе гаспадаркі, якія ўваходзяць у раён суцэльнага засеву, абавязаны скарыстоўваць на засеў выключна насеньне аднаго сорту, дзеля чаго ўсе гаспадаркі абавязкова павінны абменьваць звычайнае або рознагатунковае насеньне на адзін сорт.

ПРА БУДАЎНІЦТВА ЎНІВЭРСЫТЭЦКАГА ГАРАДКА.

СНК заслухаў інфармацыю Белдзяржбуду аб ходзе будаўніцтва ўнівэрсытэцкага гарадка. СНК прыняў да ведама заяву дырэктара Белдзяржбуду аб тым, што Белдзяржбудам будуць здадзены НК Асьветы 4 карпусы ўнівэрсытэцкага гарадку 1-га лістапада г. г. Прыняты меры для правядзеньня каналізацыі і вадаправоду да гарадка.

ПРА ПАДРЫХТОЎЧЫЯ РАБОТЫ ПА ПАБУДОВЕ ДОМУ ЎРАДУ.

СНК заслухаў інфармацыю галоўнага інжынэра па пабудове Дому Ураду аб падрыхтоўчых работах па пабудове. СНК зацьвердзіў асноўныя тэрміны пабудовы Дому Ураду. Камісіі СНК па пабудове Дому Ураду даручана ўжыць захады да максымальнага скарачэньня тэрміну скан чэньня будаўніцтва з такім разьлікам, прыкладна, каб урадавыя ўстановы змаглі перасяліцца летам 1931 г.

СНК пацьвердзіў таксама пастанову сваю аб тым, што ў бягучым годзе павінен быць заложан фундамэнт пад галоўны корпус, каб у наступным будаўнічым сэзоне забясьпечыць кладку сьцен з ранняе вясны. Прэзыдыуму гарсавету даручана прасачыць за Камгасам, каб абавязкова да зімы была скончана распачатая праца па адбудове кватэр для высяляемых жыльцоў.

Камісіі СНК па пабудове Дому Ўраду і Белдзяржбуду даручана перавесьці ўсю працу на бесперапынную вытворчасьць.

ПРА ПАДРЫХТОЎКУ РАБОЧАЙ СІЛЫ ДЛЯ ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

СНК пастанавіў перавесьці з Менску ў Віцебск 500 чалавек беспрацоўных для падрыхтоўкі на швэйнай фабрыцы.

ПРА БУДАЎНІЦТВА АДКОРМАЧНЫХ ПУНКТАЎ.

З мэтай павялічэньня таварнасьці мяса праз адкормачна-нагульныя апэрацыі, яшчэ раней былі прыняты меры да пабудовы новых валоўняў у дадатак да існуючых. Выслухаўшы інфармацыю НК Гандлю аб ходзе будаўніцтва адкормачных пунктаў, СНК абавязаў Менскі, Віцебскі і Гомельскі АВК зараз-жа праверыць ход будаўніцтва гэтых пунктаў для сьвіней і забясьпечыць сканчэньне гэтага будаўніцтва не пазьней 15 кастрычніка г. г. Менскаму, Гомельскаму, Бабруйскаму, Мазырскаму, Магілеўскаму і Аршанскаму АВК даручана тэрмінова праверыць ход будаўніцтва валоўняў, забясьпечыўшы выкананьне гэтага будаўніцтва такшы сама не пазьней 15 кастрычніка. НК РСІ і Пракуратуры даручана прасачыць за выкананьнем гэтага будаўніцтва да тэрміну, прыцягваючы вінаватых у зрыве гэтага будаўніцтва да адказнасьці.

ПРА АРГАНІЗАЦЫЮ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧАГА БАЛОТНАГА ІНСТЫТУТУ.

Улічваючы наяўнасьць у БССР значных балотных плошчаў, а таксама буйныя разьмеры мэліарацыйных работ, якія разгортваюцца на тэрыторыі БССР, тыповасьць балотных масываў і наяўнасьць спэцыяльных навукова-дасьледчых устаноў па мэліарацыі і культуры балот, СНК прызнаў пажаданым і сваечасовым паставіць пытаньне аб арганізацыі ў БССР Усесаюзнага Навукова-Дасьледчага Інстытуту з цэнтральнымі ўстановамі ў г. Менску, як навуковай адзінкі, уваходзячай у склад Усесаюзнай С.-Г. Акадэміі імя Леніна.

НК Земляробства разам з НДІ даручана скласьці дакладную запіску з хадайніцтвам перад Саюзным Урадам аб арганізацыі ў БССР Усесаюзнага Балотнага Інстытуту.

ПРА КАМАНДЫРАВАНЬНЕ ЧЛЕНАЎ СНК У МАСКВУ.

СНК пастанавіў камандыраваць у Маскву т. Галадзеда, Калніна, Рачыцкага, Мікуліча і Грысевіча для ўдзелу ў пасяджэньні СНК СССР па пытаньні аб кантрольных лічбах на 1929-30 г.

Праф. Крыльцоў з працы зьнят

ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ ПАРЫТЭТНАЙ КАМІСІІ НКА І СНП ПА СПРАВЕ ПРАФ. КРЫЛЬЦОВА.

Разгледзіўшы справу праф. Крыльцова па абвінавачаньню яго ў ідэалёгічных скажэньнях пры чытаньні ім дзяржаўнага права на катэдры БДУ і азнаёміўшыся з усімі матар'яламі па гэтым пытаньні, як-та: а) заметкамі ў газэце „Звязда“ № 195 ад 28-VIII „Рупар буржуазнай ідэалёгіі на катэдры БДУ“ і ў № 204 ад 7-IX 1929 г. „Яшчэ аб рупары буржуазнай ідэалёгіі“; б) двума адказамі на заметкі праф. Крыльцова „Усердие не по разуму“, „Белыми нитками“; в) дакладной запіскай рэктара Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту праф. Пічэты; г) заключэньнем праф. Галанзы аб якасьці яго друкаваных прац і выкладаньня; д) з паказаньнем па гэтаму пытаньню дацэнта Канапліна, праф. Грэдынгера і былых студэнтаў праф. Крыльцова: т. т. Судакова, Якэля, Фамчанкі, Ражкоўскага, Пражогі, Шульмана і іншых, парытэтная камісія адзначае:

1. Лічыць устаноўленым, што ў выкладаньні праф. Крыльцовым „Дзяржаўнага права“ на катэдры БДУ мелі месца немарксысцкае тлумачэньне пытаньняў: дзяржавы, грамады, нацпалітыкі, сувэрэнітэту і інш.

2. У чытаемым праф. Крыльцовым курсе дзяржаўнага права не было марксысцкай вытрыманасьці.

3. Чытаемы праф. Крыльцовым курс дзяржаўнага права прадстаўляў канглямэрат розных тэорый і ідэй і зусім не быў злучан марксысцкім аналізам.

4. У праграмах і выкладаньні апісацельны бок пераважаў над сацыялёгічным.

5. Пры выкладаньні буржуазнага дзяржаўнага права зусім ня ўскрывалася клясавая сутнасьць розных дзяржаўных форм.

6. На лекцыях праводзіліся няўмесныя анэкдоты як палітычнага, так і не палітычнага характару.

7. Поўнае незадаваленьне студэнцтва выкладаньнем праф. Крыльцова, што сьцьвярджаецца нязначным лікам (5-6 студ.) наведваньня яго лекцыяў.

На падставе ўсяго вышэйадзначанага, парытэтная камісія аднагалосна пастанаўляе:

1. Прызнаць зьняцьце праф. Крыльцова праўленьнем БДУ з працы праф. БДУ правільным.

2. Лічыць немагчымым і палітычна шкодным даручэньне выкладаньня дзяржаўнага права праф. Крыльцову.

3. Аб пастанове давесьці да ведама грамадзкасьці праз друк.

Арганізацыя Вышэйшай Тэхнічнай Навучальнай установы ў БССР.

У сучасны момант Наркамасьветы з удзелам спэцыялістаў разглядае пытаньне аб арганізацыі ў БССР Вышэйшай Тэхнічнай Навучальнай установы. Выходзячы з напрамку разьвіцьця народнай гаспадаркі і прамысловасьці Савецкай Беларусі мяркуецца ВНТУ арганізаваць палітэхнічнага тыпу,—гэта значыцца шматфакультэтны ВНТУ.

Вышэйшую Тэхнічную Навучальную Ўстанову мяркуецца адчыніць у складзе такіх факультэтаў: мэханічнага з 2 аддзяленьнямі—сярэдняга машынабудаўніцтва і сельска-гаспадарчага машыннага будаўніцтва; будаўнічы факультэт з аддзяленьнямі фабрычна-заводзкага будаўніцтва і жыльлёвага будаўніцтва; факультэт па падрыхтоўцы інжынэраў эканамістаў.

Адчынены сёлета пры БДУ хіміка-тэхналёгічны факультэт будзе таксама ўліт у Выш. Тэхн. Навучальную ўстанову, як самастойны факультэт.

Абгаварваецца таксама пытаньне аб магчымасьці і мэтазгоднасьці адчыненьня пры ВТНУ пар[illegible] перадачай у склад апошняга гідратэхнічнага і тарфянога аддзяленьняў мэліярацыйнага факультэту Сельска-Гаспадарчай Акадэміі.

Надзвычайна складаным пытаньнем пры арганізацыі ВТНУ зьяўляюцца кадры, з якіх будзе складацца студэнцтва апошняга. Асноўнай базай для камплектаваньня ВТНУ прызнаны рабфакі дзённыя і вячэрнія, адпаведныя тэхнікумы і прафшколы, якія пабудаваны на базе сямігодкі. Пры гэтым праграмы тэхнікумаў і адпаведных факультэтаў ВТНУ павінны быць прыстасаваны так, каб скончыўшыя тэхнікумы пасьля 3-х гадовай практыкі мелі магчымасьць паступіць на другі курс ВТНУ.

Прымаючы пад увагу, што ў бліжэйшыя гады рабфакі штогод будуць выпускаць ня больш 500 асоб, з якіх на долю ВТНУ прыпадае максымум 200 чалав., Наркамасьветы выказваецца за неабходнасьць з будучага навучальнага году пашырыць сетку дзённых і вячэрніх рабфакаў, адчыняючы ня толькі першыя, але і апошнія курсы. Сетка рабфакаў павінна быць пабудавана такім чынам, каб мець штогод ня менш 800 скончыўшых.

Студэнты будучай ВТНУ павінны быць забясьпечаны непарыўнай вытворчай практыкай, а таксама мець сталую сувязь з прадпрыемствамі ўвесь час сваёй вучобы ў ВТНУ, а так[illegible] месцам знаходжаньня апошняй вызначан горад Гомель, [illegible] розныя буйныя прадпрыемствы.

Распрацоўка пляну арганізацыі ВТНУ, неабходнага будаўніцтва, навуковага і навучальнага абсталяваньня, вызначэньне адпаведных сродкаў даручана спэцыялістам.

У будучым навучальным годзе [illegible] вышэйшую тэхнічную навучальную ўстанову мяркуецца ўжо адчыніць.

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы 29-30 г.

Ачысьціць 1.600.000 пудоў насеньня.

ЦК камітэту сялянскай узаемадапамогі даў мясцом цэлы шэраг дырэктыў аб сваечасовай падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы 1929-30 г. Па пляну мяркуецца абмяняць на сартавы 300.000 пуд. аўса, загатовіць 600.000 пуд. [illegible] 1.600.000 пуд. [illegible] ужо пракатных пунктаў [illegible]лена арганізавана 53 новых [illegible]. Апрача існ[illegible] старыя пункты новымі машынамі. Таксама пастаноўлена арганізаваць 823 працоўныя дружыны (да гэтага часу ўжо арганізавана 609 дружын).

Кантрактацыя 125000 гэкт. аўса.

У часе вясеньняй сяўбы 1929-30 г. па БССР мяркуецца [illegible] праводзіцца 70.000 р., у асноўнай сваёй частцы будуць разьмеркаваны паміж тымі калгасамі, вытворчымі аб'яднаньнямі, якія будуць кантрактаваць свае ярвыя пасевы.

„Дзень ураджаю“ у Менску.

„Дзень ураджаю і калектывізацыі“ у Менску будзе адзначан урачыстымі пасяджэньнямі і арганізацыяй с.-г. выставак. 13 кастрычніка ў Доме Культуры адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне савецкіх і прафсаюзных арганізацый. У Цэнтральным Доме Селяніна, у савгасе Вялікая Сьлепня і ў в. Патроўшчына маюць быць арганізаваны с.-г. выстаўкі, у якіх будуць прымаць удзел НІ Інстытут, балотная і расьлінаводныя станцыі.

14 кастрычніка пры ўдзеле грамадзкіх арганізацый і рабочых дэлегацый мяркуецца закладка буйнай малочна-садова-гароднай фэрмы.

Чырвоны абоз.

Сяляне прыгараднага Кальварыйскага сельсавету (Менская акруга) наладзілі чырвоны абоз.

Хлеб колькасьцю 300 пудоў быў здадзен у нядзелю, 29 верасьня, на каапэрацыйныя пункты.

Антырэлігійная выстаўка.

У клюбе імя Леніна адчынілася вялікая антырэлігійная выстаўка, якая адбівае шкоднасьць рэлігіі і контррэвалюцыйную ролю клерыкалаў.

Выстаўка будзе адчынена ў працягу некалькі тыдняў.

Дзень індустрыялізацыі па саюзу савгандальслужачых даў 12388 руб.

Па няпоўных яшчэ вестках „Дзень індустрыялізацыі“ па саюзу савгандальслужачых па БССР даў 12.388 руб.

Весткі з месц паступаюць далей.

На бесперапынны рабочы тыдзень.

30 верасьня адбылася нарада Менскага прафактыву саюзу савгандальслужачых. Нарада абгаварыла пытаньне аб пераходзе ўстаноў, якія аб'ядноўваюцца саюзам савгандальслужачых, на бесперапынны тыдзень з 7-гадзінным рабочым днём.

Нарада пастанавіла да 15 кастрычніка перавесьці працу ўсіх устаноў на бесперапынны тыдзень з 7 гадз. рабочым днём, ня ўключаючы ў апошні паўгадзіны на сьнеданьне.

* *

Пры Нар. Кам. аховы здароўя адбылася нарада інспэктароў, якая ўхваліла перавесьці з 5 кастрычніка ўсе мэдычна-санітарныя ўстановы на бесперапынны рабочы тыдзень. У выглядзе вопыту частка ўстаноў будзе пераведзена на 5-ціднёўку.

Прыём на вячэрні рабфак.

Скончыўся прыём у вячэрні рабфак. Сёлета прынята 110 чалавек рабочых Менскіх фабрык і заводаў. На яўрэйскае аддзяленьне рабфаку яшчэ будзе прынята дадаткова 25 чалавек. Заняткі пачнуцца 8-га кастрычніка.

Рабочыя вывучаюць пяцігодку.

Саюз сувязі распрацаваў шэраг мерапрыемстваў па вывучэньні пяцігодовага пляну. Выпускаюцца спэцыяльныя дыяграмы, а таксама дыяпазытывы, дзе паказана разьвіцьцё гаспадаркі на працягу пяцігодкі.

Пяцігодка будзе шырока абгаворана на саюзных сходах.

Накіраваньне маладых дактароў на працу.

Нарказдраў разьмеркаваў па акругах 33 студэнтаў-практыкантаў, якія праходзілі практыку ў Менску. З агульнай колькасьці 7 чал. накіравана ў Віцебшчыну, па 5 чалавек—у Магілеўшчыну і Мазыршчыну, а рэшта— па іншых акругах БССР.

Падвышэньне паліт-культурнага ўзроўню членаў саюзу.

ЦП саюзу савгандальслужачых арганізуе школу-перасоўку для абслугоўваньня членаў саюзу па раёнах Меншчыны. Школа ставіць мэтай падвышэньне палітычна-культурнага ўзроўню членаў саюзу. Школа-перасоўка абслужыць Бягомльскі, Смалявіцкі, Халопеніцкі і Бярэзінскі раёны.

Поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць.

Згодна пляну ЦПС працмастацтва ў наступным годзе будзе поўнасьцю ліквідавана няпісьменнасьць сярод членаў саюзу. У Менску, Віцебску і Гомелі адчыняюцца спэцыяльныя школы, разьлічаныя на 10-12 чал. На набыцьцё падручнікаў адпушчана звыш 1000 рублёў.

Падрыхтоўка кіраўнікоў калгасаў.

Наркамасьветы адчыняе з 15 кастрычніка ў Смалянах (Аршаншчына) школу для калгасьнікаў з гадавым курсам навучаньня. Школа будзе рыхтаваць кіраўнікоў і арганізатараў калгасаў; у школу будзе прынята 60 асоб. Камплектаваньне школы будзе праводзіцца па камандыроўках калгассаюзу.

Перапіс няпісьменных у Менску.

З 6-га кастрычніка ў Менску пачнецца перапіс няпісьменнага і малапісьменнага насельніцтва, а таксама дзяцей школьнага ўзросту, якія не наведваюць школ. [illegible]дзіць яго будуць студэнты навучальных устаноў.

Перапіс мае на мэце высьветліць усіх няпісьменных, каб ахапіць іх на 100 пр. лікпунктамі.

Антырэлігійныя насьценгазэты.

Менскі акруговы савет Бязбожнікаў накіраваў у раёны і мястэчкі антырэлігійныя насьценгазэты ў колькасьці 190 экз.

У насьценгазэтах зьмешчан багаты матар'ял па розных антырэлігійных пытаньнях.

Праводзіцца дапаўніцельны прыём.

Да 15-га кастрычніка г.-г. у Белдзяржкаахтэхнікум у Віцебску праводзіцца дапрыём на 2-гі курс тэхнікуму 10 асоб. Скончыўшыя у 1927-28 і 1928-29 вуч. годзе 9 годкі, агульна адукацыйныя курсы і іншыя, адпавядаючыя ім па тыпу вучэбныя ўстановы будуць прымацца бяз іспытаў. Перавага аддаецца скончыўшым спэцклясы каапэрацыйнага ўхілу. Па ўзросту прымаюцца ня ніжэй 18 гадоў.

З ліку прынятых, ня менш 50% будзе задаволена стыпэндыяй.

Навіны Белдзяржкіно.

Пачаліся здымкі карціны „Чорная кроў“ з жыцьця рабочых нафтавай прамысловасьці Польшчы. Карціна таксама адбівае здрадніцкую ролю ППС. Рэжысэр Тарыч з сваім пастановачным калектывам выехаў для натурных здымак у горад Грозны.

* * *

Здыманьне карціны „Волат“ скончана. Карціна малюе Беларусь у мінулым і ў часе Кастрычнікавай рэвалюцыі.

* *

У Віцебскай акрузе скончаны натурныя здымкі карціны „Хамелеон“. Карціна адбівае прыстасоўваньне буржуазных элемэнтаў да нашых умоў і іх выяўленьне.

* * *

У хуткім часе выпушчаецца ў пракат мастацкая карціна „Атэль Савой“ з эпохі паўстаньняў у Гомельшчыне ў 1919 г.

* *

На Беларускую кіно-фабрыку для працы запрошан рэжысэр Двіган, якому даручана распрацаваць сцэнары на тэму аб антысэмітызьме.

* *

Беларускі пісьменьнік А. Александровіч прызначан намесьнікам заг. Белдзяржкіно па літаратурна-мастацкай частцы.

* *

Пры дзіцячым кіно „Юны піанэр“ арганізавана педагагічна-мастацкая рада з 14 асоб. Рада будзе прагледзваць рэпэртуар кіно-карцін „Юны піанэр“.

* *

З 15-га кастрычніка пры кіно-фабрыцы адчыняецца сцэнарная майстэрня. Прыём будзе праведзен у Менску.

Са[illegible] спаборніцтва на мёртвым пункце.

Спаборніцтвы ў сельскіх мясцовасьцях не адчуваюцца.

Праца па сац. спаборніцтву ў прадпрыемствах сувязі разгорнута недастаткова. Зусім адсутнічаюць індывідуальныя спаборніцтвы паміж аддзеламі і цэхамі. Вельмі слаба праходзіць праца па ўтварэньню ўдарных брыгад, а там, дзе яны ёсьць, ніякай працы не праводзяць. Адсутнічае справаздачнасьць перад шырокімі коламі аб дасягненьнях, недахопах і выніках працы па спаборніцтву.

Асабліва кепска разгортваюцца спаборніцтвы ў сельскіх мясцовасьцях, дзе яны амаль не адчуваюцца.

З боку Акраддзяленьняў саюзу наглядаюцца нядбайныя адносіны да кіраўніцтва спаборніцтвамі. Весткі аб спаборніцтвах накіроўваюцца ў ЦП саюзу з вялікім спазьненьнем. Полацкая і Мазырская акруга нават ніякіх вестак не прадставілі.

Прэзыдыум ЦП саюзу сувязі пасьля абгаварэньня пытаньня аб ходзе працы па сац. спаборніцтву запрапанаваў усім арганізацыям у тэрміновым парадку прыступіць да праверкі і агляду працы па сац. спаборніцтву, праверыць працаздольнасьць вытворчых камісій і папоўніць апошнія працаздольнымі таварышамі.

Прэзыдыум пастанавіў арганізаваць у кожным цэху вытворчы куток, дзе павінны быць паказаны дасягненьні, недахопы ў працы, брак, узорная праца і г. д.

Па лініі клюбнай працы неабходна рэгулярна праводзіць гутаркі і вечары запытаньняў і адказаў на вытворчыя тэмы. Трэба практыкаваць паказальныя суды над гультаямі, прагульшчыкамі і бюракратамі.

Прэзыдыум адзначыў, што тэмп працы акраддзяленьняў вельмі слабы. Задачы, якія зараз стаяць перад саюзнымі арганізацыямі, патрабуюць ад кіруючых органаў рашучага пералому ў бок ажыўленьня працы.

Акраддзяленьням— Полацкаму, Аршанскаму і Мазырскаму—за невыкананьне дырэктывы ЦП і за несваячасовае прадстаўленьне вестак аб ходзе працы па сац. спаборніцтву ўхвалена абвясьціць суровую вымову.

Сур'ёзную ўвагу—шаўкоўніцтву.

Дацэнт БДУ т. Зьбіткоўскі аб стане разьвіцьця шаўкоўніцтва ў БССР нашаму супрацоўніку паведаміў наступнае:

— Праблема шаўкоўніцтва ў БССР,—кажа т. Зьбіткоўскі, — вышла зараз з стадыі аматарства паасобных працаўнікоў. Гэта справа з кожным годам набывае ўсё большую ўдзельную вагу ў нашай народнай гаспадарцы. Зараз мы маем ужо шэраг дакладных фактаў, вывучаных на вопыце, аб тым, што шаўкоўніцтвам можна займацца ў такіх раёнах, аб якіх раней ніхто і ня сьмеў нават марыць. Шаўкоўніцтвам можна займацца ня толькі ў паўднёвай частцы Савецкага Саюзу, але нават у такіх мясцох, як УССР і БССР.

Аб шырокай пастаноўцы шаўкоўніцтва ў нашай народнай гаспадарцы спыніўся ў сваім артыкуле т. Рыскулаў („Известия“, № 197 за 28-VIII). За апошнія некалькі год мы маем рост шаўкоўніцтва больш, як у 3 разы, ня толькі ў Сярэдняй Азіі, але нават у больш халодных, паўночных краінах, як УССР.

І ня толькі на Украіне, дзе тэмп шаўкоўніцтва шпарка расьце: мы стаім перад фактам арганізацыі шаўкаводнага пункту ў Духаўшчыне, Смаленскай губ., дзе да гэтага часу ня было ніводнага дрэва морвы.

Што-ж мы маем зараз у сэнсе шаўкоўніцтва ў БССР? У цэлым шэрагу пунктаў у нас ёсьць значныя зарасьнікі морвы. У савгасе Івакі, Гомельскай акр. ёсьць значны выхавальнік з дрэвамі морвы, у Койданаўскім раёне таксама засеяны значны пляц морвы. У Азяранах, Мазырскай акр., ёсьць зарасьнік з 200 дарослых дрэў. Апроч гэтага, ёсьць значная колькасьць дрэў у выхавальніках Менскага Камгасу, ВСНГ і інш.

Летась на тэрыторыі БССР было атрымана да 4 кіл. шаўкавічных коканаў. Сёлета выкармка шаўкавічных чарвей праводзілася ў Азяранах, Цэнтральным Доме Селяніна ў Менску, у Борхаве, Шэрсьціне і Церахоўцы, Гомельскай акр.; апроч гэтага, выкормку праводзіла Мазырскае краязнаўчае т-ва і паасобныя сяляне. Усяго атрымана ад выкормкі г. г. звыш 10-ці кіл. коканаў. У хуткім часе ў Цэнтральным Доме Селяніна будзе арганізавана выстаўка коканаў і размотка іх. На лета мяркуецца арганізацыя сталага пункту па пашырэньню шаўкоўніцтва ў Азяранах, дзе ёсьць усе ўмовы для арганізацыі яго.

Зараз перад намі стаіць праблема аховы існуючых зарасьнікаў морвы і пашырэньне новых пляцаў гэтае культуры. Аднача сова трэба ўзмацніць працу па пашырэньню ведаў аб шаўкоўніцтве.

Зарасьнікі морвы, якія маюць да 1000 штук дарослых дрэў, складаюць кармавы фонд, і яго пара ўжо выкарыстаць больш рацыянальна, на што павінны зьвярнуць увагу НКЗ і ВСНГ.

СУД.

За скрыўленьне клясавай лініі.

Вёска Лошніца, Барысаўскага раёну, мае каля 800 гаспадароў. Калі некалькі год таму назад у Лошніцы было адчынена сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства, на чале Праўленьня стаў член дзяржаўнай царскай думы Алесь Гаўрыльчык. Таварыства, з прычыны злоўжываньняў Гаўрыльчыка, хутка занепала. Гаўрыльчык папаў пад суд, панёс адпаведную кару, і лошніцкая беднята зноў сабрала паі і абрала новы склад праўленьня.

З прычыны таго, што лошніцкая ячэйка КП(б)Б і сельсавет кепска падрыхтаваліся да перавыбараў праўленьня, на пасаду старшыні пралез Янка Зьмітраў Курган, які ў Лошніцы мае шмат сваякоў і „добрых знаёмых“ кулакоў.

Вясной г. г. Курган, ня гледзячы на тое, што беднята ня мела свайго насеньня, 500 пудоў насеньня раздаў выключна сваякам і кулакам у падзяку за падтрыманьне яго на выбарах. Падрыхтаваныя да засеву палі беднякоў засталіся незасеянымі.

Грашовыя ссуды як, напрыклад, на пакупку коняй, Курган таксама распазычыў багатым, якія мелі па 2-3 коняй.

Ня вёў вучоту насеньня і раздаў [illegible] карысных мэтак сваякам нават без [illegible]раднай ачысткі і па павышанай расцэ[illegible], каб беднята не магла набыць насеньня, да таго-ж ён растраціў насеньня [illegible] 65 р. 63 кап.

Усю працу ў таварыстве Курган праводзіў самастойна, без пагаджаньня з астатнімі членамі праўленьня і камісіі сялянскай узаемадапамогі.

За гэтыя злачынствы Народны Суд Барысаўскага раёну прыгаварыў Янку Зьмітрава Кургана на пяць год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, з пабаўленьнем у правах на тры гады. Прымаючы пад увагу некаторыя акалічнасьці, суд зьменшыў Кургану пакараньне да трох год.

Крымінальна-касацыйнае аддзяленьне Менскага акруговага суду прыгавар [illegible] суду цалкам зацьвердзіла, а скаргу Кургана пакінула бяз вынікаў.

Д. К.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 2-е КАСТРЫЧНІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.09	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	127.25	129.25
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.05	100.45
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.42	25.52
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.40	10.7[...]
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.14	25.[...]
2 „ „ „ проц.	25.24	25.[...]
2 „ „ „ 6-проц.	25.24	25.3[...]
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	100.96	101[...]
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.3	

Апавяшчэньні.

— АК КПБ, ЦСПСБ і Акрсавет, шэфтаварыства 2-X-29 г., а 7 гадзіне ўвечары у вялікай залі клюбу К. Маркса склікае нараду апоргаў, гарадзкіх ячэек КПБ, старшынь фабзаўмясцкомаў і старшынь Выканбюро шэфтаварыстваў па пытаньню аб удзеле рабочых у сьвяткаваньні „Дню Ураджаю і калектывізацыі“.

— У пятніцу, 4 кастрычніка, а 6 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу К. Маркса адбудзецца агульна-гарадзкая канфэрэнцыя працоўных жанчын (хатніх гаспадынь яўрэек), на якой будзе зроблен даклад аб значэньні іюдэйскіх асеньніх рэлігійных сьвят.

Уваход на канфэрэнцыю для дэлегатак па мандатах, якія разасланы па Жан[illegible] і прадпрыемствах.

Яўка ўсіх вылучаных і абраных дэлегатаў абавязкова і без спазьненьня.

МЕНАКРСАВЕТ СВ[...]

— З 3-га кастрычніка г. г. начынаецца пераулік беспрацоўных сябраў саюзу працасьветы г. Менску, у тэрміны:

Прозьвішча якіх пачынаюцца на літары: А, Б, В, Г, Д, Е—3 кастрычніка.
На літары—Ж, З, І, К, Л, М 4-га „
На літары—Н, О, П, Р, С, Т 5-га „
Усе астатнія беспрацоўныя 6-га „

Адказны рэдактар **П. ШАСТАКОЎ.**

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“.	З панядзелка 30 верасьня. „БЭНЭФІС КЛЁУНА ЖОРЖА“ драма ў 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка «СОВКІНО». Пачатак а 7 гадзіне.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 30-га верасьня. МАСТАЦКІ ФІЛЬМ „СІНІЯ КАЎНЯРЫ“ у 5 частках. Звыш праграмы: камэдыя „ЛАСО“ у 2-х част. Пачатак а 7 гадзіне
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	З ПАНЯДЗЕЛКА, 30-га ВЕРАСЬНЯ. МАСТАЦКАЯ ДРАМА „ЧАЛАВЕК З ПАРТФЭЛЕМ“ Пачатак а 7 з пал. гадзіне.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“.	2 фільмы вытворчасьці БДкіно. „ДЖЭНТЛЬМЭН І ПЕВЕНЬ“ у 6 частках. „Бунт зубоў“ у 2 частках. Пачатак а 3 гадзіне 30 хв. Каса а 2 гадз.

Галоўлітбел 595.

Арцель Інвалідаў шаўцоў № 18 у гор. Барысаве з 13-IX г. г. лічыцца ня існуюч., як увайш. ў арцель інвалід. № 6

„КРАСНЫЙ ВОИН“.

Усе ўстановы, арганізацыі і асобы, якія маюць прэтэнзіі да арцелі № 18 павінны ў працягу 2 тыдняў падаць аб гэтым заяву: Барысаў, арцелі інвалідаў № 6 „Красный Воин“. Пасьля гэт. тэрміну ніякія прэтэнзіі разглядацца ня будуць.

Праўленьне арцелі № 6.

Гэтым паведамляецца, што згодна пастановы ВСНГ БССР **Беларускі Дзяржаўны Сырніковы Трэст**, які знаходзіцца ў Гомелі, аб'ядноўваецца **З ЛЯСНЫМ ТРЭСТАМ БЕЛАРУСІ „ЛЕСБЕЛ“**, які знаходзіцца ў Менску, з 1 кастрычніка 1929 г.

Месца знаходжаньня новага аб'яднанага трэсту будзе ў г. Менску.

З 27 верасьня г. г. просім усю кліентуру па ўсіх пытаньнях, адносінах, справах і г. д. зьвяртацца ў „Лесбел“ у Менску.

Па разьліках за апэрацыі да 1-X 1929 г. трэба зьвяртацца ў бухгальтэрыю был. Бел. Сырніковага Трэсту: Гомель, рог Савецкай і Сялянскай вуліц.

Пры гэтым паведамляем, што ўсе рэклямацыі, грашовыя прэтэнзіі і інш. павінны быць прад'яўлены не пазьней 15 кастрычніка 1929 г., пасьля якога тэрміну ніякія прэтэнзіі прыняты ня будуць.

ЛІКВІДКОМ БЕЛ. СЫРНІКОВАГА ТРЭСТУ.

Прэзыдыум Магілеўскай акруговай калегіі абаронцаў БССР просіць лічыць ня маючым моцы пасьведч. № 47, выдадзенае прэзыдыумам был. члену Калегіі Абаронцаў Вайнрубу Ізраілю Саламонавічу, які з Калегіі выключ. 23-9 1929 г.

Нам. старш. Прэзыд. Калецкі. Сэкратар Элькінд.

Згодна пастановы ЭКАНА БССР ад 3 чэрвеня 1929 г. АДДЗЕЛ ЛЕСАРАСПРАЦОВАК НАРКАМЗЕМУ БЕЛАРУСЬ (ЛЕСЗАГ) З 1-ГА КАСТРЫЧНІКА 1929 Г.

спыняе сваю дзейнасьць-ліквідуецца.

Установы і асобы, якія маюць прэтэнзіі к ЛЕСЗАГУ, павінны зьвярнуцца аб гэтым у ліквідацыйную камісію ЛЕСЗАГУ НКЗ не пазьней 1 лістапада 1929 г. (Менск, Савецкая вул., № 71).

Пасьля адзначанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Старшыня Ліквідкому ШУМІЛАЎ.

МЕНСКІ АКРУГОВЫ ІНСПЭКТАР ГАНДЛЮ ДАВОДЗІЦЬ ДА ЎСЕАГУЛЬНАГА ВЕДАМА, што ім на падставе палажэньня аб гандлёвай рэгістрацыі 27 верасьня 1929 г. УНЕСЕНЫ Ў КНІГУ „Е“ 3-ГА РАЗЬДЗЕЛУ ГАНДЛЁВАГА РЭЕСТРУ СССР ПА МЕНСКАЙ АКРУЗЕ ПАД № 33.

Упаўнаважаны па БССР Акц. т-ва „ВЗОК“. Мэта дзейнасьці: снабжэньне супроцьпажарнымі і камунальнымі прыладамі для камунальных гаспадарак.

Месцазнаходжаньне: МЕНСК, САВЕЦКАЯ № 97, кв. 8 т. ЛЕВІН М. І.

Час. вык. аб. Менскага акр. інспэктара гандлю ЭПШТЭЙН.

2, 3, 4 і 5 кастрычніка будзе праводзіцца чыстка ячэйкі Менскай Акстрахкасы ў памяшканьні клюбу Шчытачнай фабрыкі (вул. Р. Люксэмбург). Праверком і ячэйка запрашаюць т.т. прысутнічаць на сходах па чыстцы ячэйкі.

Пачатак сходаў па чыстцы а 5 гадзіне.

Праверком: Самойлаў, Загарэўскі, Дземыц.

Полацкі акруговы Загс паведамляе, што на 5 кастрычніка г. г. назначана справа аб скасаваньні шлюбу КРЫ[...]СКАГА Восіпа з гр-кай ФІЛІМОНЧ[...] Агафіяй.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Сяброўскі білет № 283086 кім [...] Гульчэнка і. Р.—выд. фабк. ф-кі „Дв[...]“ кв. № 631 п.

— Пашпарт. нарадж. 1888 г. Ша[...]ліна П. Н.—выд. Рэчыцкім РВК, кв. № 631 п.

— Бальнічны ліст Фрэнкель Х. [...] выд. Рэчыцкай амбулятор., кв. № 631[...]

— Паявая кніжка № 1666 Краў[...] М. Е., выд. Цімкавіцк. спаж. т-ва, кв. 625п.

— Пасьведчаньне за № 611 Малі[...] П., аб сканчэньні Мсьціслаўскага пэдтэхнікума, кв. № 626п.

Друкарня БДВ.